Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся.

КОШТ НУМАРУ 4 кап.

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Неыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 70 к.
„ 3 „	2 р. — к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародніх	— 20 к.
мясцовыя	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок нанпарэлі пасьля тэксту	— р. 50 к.
За радок нанпарэлі пасярод тэксту	1 р. — к.
За радок нанпарэлі перад тэкстам	1 р. 50 к.

Сьвешныя из 50 проц. даражэй.

Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Бесправоўн. і чырвонаармейцы за дакумант	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

8 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 288 (2180) Аўторак, 20-га сьнежня 1927 г.

З ясным ленінскім разуменьнем.

XV зьезд УсеКП(б) ухваліў пастанову па дакладу абранай зьездам камісіі для разгляду меншавіцкай і раскольніцкай дзейнасьці трацкісцкай апазіцыі. **Зьезд ухваліў выключыць з партыйўсіх актыўных працаўнікоў трацкісцкай партыі.**

Усе матар'ялы, якія маюцца ў распараджэньні партыі, гавораць аб тым, што трацкісты заснавалі новую меншавіцкую партыю, якая паставіла сабе мэтай змагацца з ленінскай бальшавіцкай партыяй, да таго, каб расхістаць адзінства партыі, падарваць яе аўтарытэт у вачох пралетарыяту ўсяго сьвету і ў прыватнасьці ў вачох пралетарыяту і працоўнага сялянства Савецкага Саюзу. Для гэтай мэты апазіцыя карысталася ўсякімі сродкамі, пачынаючы ад нелегальнай друкарні і канчаючы адкрытым выступленьнем у часе лістападаўскіх сьвят.

Партыя ня раз заклікала да парадку лідэраў трацкісцкай апазіцыі. Партыя шмат разоў зазначала ім, што далейшай сваёй раскольніцкай дзейнасьцю яна сябе паставіць па-за шэрагамі партыі. Усе гэтыя папярэджаньні апазіцыя выкарыстоўвала для ашуканства партыі, тлумачачы ўсе гэтыя папярэджаньні слабасьцю ленінскага, бальшавіцкага Цэнтральнага Камітэту.

Варта толькі наглядзець на гісторыю 2-хгадовай фракцыйнай барацьбы трацкістаў, як з усёй яснасьцю можна ўстанавіць, што лідэры апазіцыі на кожным этапе барацьбы ашуквалі партыю. Яны ашукалі давер'е партыі на XIV зьезьдзе, абяцаючы падначаліцца ўсім пастановам зьезду. Яны ашукалі ўсіх працоўных, калі крычалі аб тэрмідарыянскім пераараджэньні партыі. Яны ашукалі партыю тады, як абяцалі выканаць сваю ўласную заяву ад 16 кастрычніка 1926 г. Яны ашукалі ўвесь міжнародны пралетарыят, як крычалі, што УсеКП падтрымлівае кітайскую буржуазію, а ня кітайскія працоўныя масы.

Яны ашукалі партыю, ня выканаўшы сваўласнае абяцаньне аб спыненьні фракцыйнай барацьбы ад 8 жніўня 1927 г. Яны ашукалі Камуністычны Інтэрнацыянал, абяцаўшы адмежавацца ад рэнэгатаў і здраднікаў рабочае клясы—Суварына, Маслова, Рут-Фішэр, Розэнбэрга і г. д.

Гэтай сыстэматычнай маной трацкістам удалося часова пацягнуць за сабой нязначныя адзінкі найбольш адсталых членаў партыі. Але досыць было партыі павесьці растлумачальную працу аб сутнасьці трацкісцкай апазіцыі, як нават і гэтыя адзінкі пачалі адыходзіць ад пазіцыі. Пасыпаліся дзесяткі заяў маскоўскіх, ленінградзкіх, тыфліскіх абманутых пралетарыяў - камуністаў, якія давялі да ведама партыі, што яны цалкам адмяжоўваюцца ад трацкісцкай партыі і абяцаюць падначаліцца ўсім пастановам зьезду і Цэнтральнага Камітэту.

На 15 зьезьдзе УсеКП(б) апазіцыя ўжо магла гаварыць толькі ад імя сваіх «генэралаў», бо масы, нават тыя, якія раней за імі ішлі, адмовіліся іх падтрымаць. Толькі меншавіцкая сутнасьць апазіцыі не дала ім магчымасьці канчаткова капітуліраваць перад зьездам.

Тыя заявы, якія былі пададзены на імя прэзыдыуму зьезду і спэцыяльна абранай камісіі, гаварылі, што апазіцыя ня хоча разбоіцца, ня зьбіраецца падначаліцца дырэктывам партыі. На патрабаваньне зьезду распусьціць фракцыю, скласьці ўсю фракцыйную зброю і адмовіцца ад сваіх меншавіцкіх, трацкісцкіх поглядаў, апазіцыя як у заявах трацкісцкай, таксама і зіноўеўскай групы адмовіліся даць ясны адказ.

Прынятая рэзалюцыя па дакладу ЦК прызнала недапушчальнасьць сумяшчэньня званьня члена партыі з прапагандай трацкісцкіх ідэй. Гэта ўжо паставіла пытаньне перад апазіцыяй: жадаюць ці не жадаюць яны застацца ў шэрагах партыі.

Прамога адказу на гэтае пытаньне апазіцыя не дала, гэта ўжо азначала, што апазіцыя згадзілася на сваё выключэньне з партыі.

Пастанова зьезду аб выключэньні трацкісцкай і сапронаўскай апазіцыі з партыі будзе адобрана ўсёй партыяй, якая ў сваіх рэзалюцыях патрабавала выключэньня іх з партыі. Партыя зрабіла ўсё для таго, каб даць магчымасьць апазіцыі зноў вярнуцца ў партыйныя шэрагі. Пасьля апошняй пастановы зьезду выключэньне трацкістаў з партыі робіцца ўжо канчатковым фактам, які пераглядацца больш ня будзе.

Партыя пасьля зьезду, вызваліўшыся ад апазіцыйнай балбатні, ізноў прыступіць да дзелавой штодзённай працы па практычнаму будаўніцтву сацыялізму. Зьезд выпрацаваў ясныя і вычарпальныя дырэктывы, якія вызначаюць шлях далейшае барацьбы і працы партыі.

З ясным ленінскім разуменьнем усіх стаячых перад намі задач, партыя заканчывае пэрыяд барацьбы з унутрыпартыйнай апазіцыяй. Ня гледзячы на цяжкія перашкоды, якія нам штодзень ладзіць міжнародны капітал, партыя пераможа ўсе труднасьці, якія перад ёй стаяць.

АНТЫСАВЕЦКІЯ БЯСЧЫНСТВЫ ПАЎДНЁВА-КІТАЙСКІХ МІЛІТАРЫСТАЎ.

Лёс супрацоўнікаў кантонскага консульства СССР.

Неправераванае паведамленьне Рэйтэра.

ЛЁНДАН, 18-XII. Агенцтва Рэйтэра з наўвагаю, што не бярэ на сябе адказнасьці, паведамляе з Ганконгу: «Водпуг вестак з Кантону, якія заслугоўваюць давер'я, віцэ-консул Хасіс знаходзіцца ў ліку 5-ці расейцаў, пакараных сьмерцю ў Кантоне 14-га сьнежня. На фатаграфіі пакараных, атрыманай з Кантону, відзён Хасіс. Яго рукі зьвязаны ззаду, на ім няма ні боты, ні шкарпэтак, якія ляжаць на зямлі, твар павернуты ўбок. Генэральны консул СССР у Кантоне і асабовы склад консульства ўсё яшчэ арыштаваны. У сучасны момант разглядаюцца расейскія дакументы, якія былі ў вялікім ліку захоплены пры наскоку на консульства».

ЧУТКІ АБ ЗАБОЙСТВЕ КОНСУЛА Ў КАНТОНЕ—НЯПРАВІЛЬНЫЯ.

ТОКІЁ, 18-12. Водпуг вестак агенцтва Сімбун Рэнго, чуткі аб забойстве савецкага віцэ-консула ў Кантоне не адпавядаюць сапраўднасьці.

Асабовы склад консульства затрыман кітайскаю ўладаю.

Шанхайскае консульства занята паліцыяй.

ШАНХАЙ, 18-12. Чыны муніцыпальнае паліцыі, дзейнічаючы водпуг загаду часовага суду, зачынілі аддзяленьні гандлёвага прадстаўніцтва СССР, савецкага гандлёвага флёту, Цэнтрасаюзу і Дальбанку. Кіраўнікі і супрацоўнікі савецкіх установ у памяшканьне не прапушчаюцца. Паліцыя заняла памяшканьні гандлёвага прадстаўніцтва і ўправы савецкага гандлёвага флёту, якія знаходзяцца ў будынку консульства.

Заява нанкінскага міністра аб апошніх падзеях.

ШАНХАЙ, 18-12. Міністр замежных спраў нанкінскага ўраду У-Чжао-Чу ў гутарцы з прадстаўнікамі чужаземнага друку наконт загаду нанкінскага ўраду зачыніць савецкія консульствы, арыштаваць і выслаць супрацоўнікоў гэтых устаноў заявіў: «Гэты захад ужыт нацыянальным урадам выключна з мэтаю самаабароны пасьля таго, як былі разгледжаны ўсе іншыя меры ўзьдзейнічаньня. У кітайскім рэвалюцыйным руху наглядаецца шкодная дзейнасьць расейцаў. Захады, ужытыя намі, маюць на мэце ліквідаваць гэтую руйнуючую небясьпечную дзейнасьць. Мы ня маем варожасьці да расейскага народу, які выказаў у адносінах да нас сымпатыю. Нашыя ўчынкі ня маюць на мэце разрыву палітычных і гандлёвых зносін».

На запытаньне наконт правільнасьці паведамленьняў з Ханькоу і Кантону ў зьвязку з прыдушэньнем камуністычнае дзейнасьці, У-Чжао-Чу сказаў: «Мы не атрымалі пацьвярджэньня падобных непаразуменьняў. Мы маем толькі ад упаўнаважанага па замежных справах з Ханькоу паведамленьне з просьбаю даць абарону расейскаму консулу з 16-цю асобамі пры праезьдзе праз Шанхай па дарозе ў Расею».

На запытаньне, як адносіцца нанкінская ўлада да расейскіх белагвардзейцаў, У-Чжао-Чу адказаў: «Кітай супярэчыць проці дзейнасьці белых расейцаў, якія хочуць на кітайскай тэрыторыі стварыць базу проці савецкага ўраду».

Арыштаваная каманда „Памяці Леніна" ў немагчымых варунках.

Ліст зьняволеных маракоў.

ЎЛАДЫВАСТОК, 16-XII. Раённы камітэт прафсаюзаў воднікаў і кіраўніцтва мясцовае канторы Савецкага Гандлёвага Флёту атрымалі наступны ліст ад 47 чалавек з экіпажу „Памяці Леніна", зьняволеных у вайсковым астрозе ў Цынань-фу:

„Ужо 9 з паловаю месяцаў мы знаходзімся ў зьняволеньні без суду і сьледзтва, без падачы нам якіх-небудзь абвінавачаньняў. Намі зроблены шматразовыя пратэсты, праведзены дзьве-тры галадоўкі, ба чыш паведамлялася ў друку, але ўсё гэта не дало ніякіх вынікаў. Зьняволены мы ў брудным каменным памяшканьні, нягодным для жыцьця. З гэтае прычыны здараюцца частыя занядужаньні, сярод нас ёсьць хворыя на брушны тыфус, трасцу і сухоты. Мэдыцынскай дапамогі амаль не даецца. Мы вельмі зморaны. У роспачы зьвяртаемся да вас з просьбаю ўжыць захады да нашага вызваленьня, бо больш цярпець мы ня можам. Сілы чалавечыя маюць граніцы; далейшыя пакуты ў гэтым засьценку будуць для нас пагібельнымі.

Зьняволеныя».

XV ЗЬЕЗД УсеКП(б).

Праца партыі на вёсцы.

Даклад тав. Молатава*).

ХАРАКТЭРНАСЬЦЬ ПРАЦЭСУ РАССЛАЕНЬНЯ НАШАЕ ВЁСКІ Ў ТЫМ, ШТО СЕРАДНЯК РАСЬЦЕ ЗА КОШТ СКАРАЧЭНЬНЯ БЕДНАТЫ. АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ПРАПАНОЎ АПАЗІЦЫІ ПРЫВЯЛО-Б ДА ЗРЫВУ БЛЁКУ РАБОЧАЕ КЛЯСЫ З СЯЛЯНСТВАМ. НАШАЯ ЗАДАЧА—СТВАРЫЦЬ БОЛЬШ СПРЫЯЮЧЫЯ ЎМОВЫ ДЛЯ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ СЯЛЯНСКІХ ГАСПАДАРАК.

МАСКВА, 16 XII. На ранішнім пасяджэньні 16 сьнежня зьезд заслухаў даклад т. Молатава аб працы партыі на вёсцы. Зазначыўшы на рознастайнасьць умоў, у якіх разьвіваецца нашая вёска ў розных раёнах СССР, і падкрэсьліўшы, што адзінае вёскі ў нас няма, т. Молатаў адзначыў асноўную розьніцу разьвіцьця сучаснае вёскі ад дарэвалюцыйнае. Гэта розьніца ў тым, што савецкая ўлада паказала для вёскі зусім новы шлях эканамічнага і сацыяльна-палітычнага разьвіцьця—шлях на вёсцы да сацыялізму.

Тав. Молатаў падае давныя аб тым,

ШТО АТРЫМАЛА СЯЛЯНСТВА

ў выніку Кастрычнікавае рэвалюцыі. Да сялянства **перайшло** каля 50 міліёнаў дзесяцін абшарніцкае зямлі і ад падраўняючага перадзелу да сялянскае беднаты і сераднякоў перайшла значная колькасьць зямлі, якая раней належала кулакам. Калі да рэвалюцыі ў карыстаньні бядняцкіх і серадняцкіх сялянскіх груп было 60 міліёнаў дзесяцін зямлі, дык зараз у іх карыстаньні маецца 136 міліёнаў дзесяцін. У карыстаньні кулацкіх гушчаў зараз знаходзіцца 4 міліёны дзесяцін, а да рэвалюцыі яны мелі каля 50 міліёнаў дзесяцін.

Тав. Молатаў адзначыў, што разам з пераразьмеркаваньнем зямельнага фонду адбываецца працэс расслаеньня сялянства. Аднак, гэты працэс характэрны тым, што сярэдняя група сялянства не зьмяншаецца, як гэта робіцца ў капіталістычнай грамадзе, а, наадварот, павялічваецца за кошт скарачэньня бядняцкае групы, меншая частка якое пралетарызіруецца, а большая ператвараецца ў серадняковы. Шмат даных аб становішчы кулацкіх гушчаў сялянства паказваюць, што хоць у апошнія гады і адбываецца рост гэтае групы сялянства, аднак яе ўдзельная вага ўсё-ж застаецца вельмі ня значнаю.

Даўшы

АНАЛІЗ БАРАЦЬБЫ МІЖ КАПІТАЛІСТЫЧНЫМІ І САЦЫЯЛІСТЫЧНЫМІ ЭЛЕМЭНТАМІ

на вёсцы і адзначыўшы правільнасьць палітыкі савецкае ўлады, накіраванае да амежаваньня росту капіталістычных элемэнтаў, т. Молатаў, зазначыў, што побач з гэтымі абмяжоўваючыі мерамі нашая задача павінна быць і ў тым, каб знайсьці правільныя эканамічныя шляхі да перамогі над капіталістычнымі элемэнтамі на вёсцы, правільныя шляхі для набудовы сацыялізму, для пераводу дробнае індывідуальнае сялянскае гаспадаркі на рэйкі буйнае калектывістычнае гаспадаркі.

Тав. Молатаў адзначыў, што на вёсцы пры наяўнасьці буйных гаспадарак дробная таварная гаспадарка знаходзіцца ў вельмі невыгодных эканамічных умовах. Вынуджана, напрыклад, што з усяго ліку сялянскіх гаспадарак трэцяя іх частка зьяўляецца гаспадаркамі не рэнтабельнымі ў адносінах выкарыстаньня ў іх коняў і сельска-гаспадарчага інвэнтару; далейшае разьвіцьцё іх немагчыма, калі яны не пярэйдуць да буйнае сельска-гаспадарчае вытворчасьці. Характэрна тое, што гэта начынае ўжо разумець само сялянства, якое зрабіла за апошнія гады значныя

ПОСЬПЕХІ Ў СПРАВЕ КААПЭРАВАНЬНЯ

сваёй гаспадаркі. Дапамогу ў гэтых адносінах нашаму сялянству аказвае нашая сацыялістычная прамысловасьць, разьвіўшая ў апошні час сыстэму ўгавораў на пастаўку сельска-гаспадарчае сыравіны, якія падпісваюцца між сацыялістычнаю прамысловасьцю і каапэрацыйнымі арганізацыямі, аб'яднаючымі вытворчасьць тае ці іншае галіны сельска-гаспадарчае сыравіны.

Тав. Молатаў зазначыў далей на вялікае значэньне калектыўных гаспадарак і камун, аб'яднаючых у сучасны момант да міліёну едакоў. Адначасна з гэтым буйную ролю набылі шматлікія таварыствы і хаўрусы (машынныя, мэліярацыйныя, насеннаводныя і інш.); становяцца цьвёрда на ногі савецкія гаспадаркі. Часам яны ўжо зьяўляюцца ўзорамі буйных гаспадарак. Неабходна загатым аказаць самае дзейнае падтрыманьне будаўніцтву савецкіх гаспадарак, каб ператварыць савецкія гаспадаркі ў цэнтры прапаганды буйных грамадзкіх вытворчых форм на вёсцы.

Дакладчык адзначыў пасьля гэтага, што ў сельскую гаспадарку мы штогод укладаем даволі буйныя сумы. У 1927—28 г. на фінансаваньне сельскае гаспадаркі будзе выдадзена каля 700 міліёнаў руб., а, згодна пяцігадовага пляну, у справу фінансаваньня будуць укладзены яшчэ больш буйныя сумы.

Закрануўшы далей

ПЫТАНЬНЕ АБ НЭП'Е,

т. Молатаў адзначыў, што 7 гадоў НЭП'у паказваюць правільнасьць таго шляху, па якім мы ідзём. Па гэтым шляху мы павінны ісьці і далей. НЭП і саюз з сялянствам—гэтыя прынцыпы павінны застацца непарушнымі.

Прамоўца крытыкуе пункт гледжаньня апазіцыі на НЭП. Апазіцыя бачыць у НЭП'е толькі адступленьні. Гэта паклёп і неразуменьне ленінскае лініі. Канец адступленьня быў агалошаны яшчэ т. Леніным на 11-м зьезьдзе партыі. З тае пары партыя вядзе наступ, узмацняючы сацыялістычныя элемэнты ва ўсёй гаспадарцы. Партыя змагалася і будзе змагацца проці поглядаў, што з серадняком нельга будаваць сацыялізм на вёсцы.

Свой агульны вывад т. Молатаў рэзюмуе так: элемэнты моцнае аграмаджанае гаспадаркі на вёсцы ў нас растуць. Мы павінны разьвіваць гэты рост, ня ўжываючы пры гэтым ніякага прымусу. Дакладчык папераджае, што ў справе разьвіцьця буйнае грамадзкае гаспадаркі на вёсцы трэба менш фантазіраваць і неабходна асьцярожнасьць. Асноўным мэтадам тут павінна быць пераканананасьць плюс падахвочваньне з боку пралетарскае дзяржавы.

Закрануўшы потым пытаньне аб умовах, забясьпечваючых існаваньне такое палітыкі на вёсцы, т. Молатаў зазначыў, што нам не хапае ў гэтай справе культуры. Бяз шырокага культурнага росту вёскі нам цяжка прасоўвацца наперад на шляху ператварэньня дробнае сялянскае гаспадаркі ў буйную.

У канцы сваёй прамовы т. Молатаў падрабязна спыніўся на прапановах апазіцыі па пытаньні аб працы на вёсцы.

ІДЭАЛЁГІЯ АПАЗІЦЫІ Ў СЯЛЯНСКІМ ПЫТАНЬНІ.

яе недаацэнка серадняка—адзначыў ён—штурхае яе на такія прапановы, якія на практыцы азначаюць зрыў блёку рабочае клясы з сялянствам.

Зьезд наладжвае т. Молатаву бурную авацыю.

* * *

Пасьля дакладу т. Молатава пачаліся спрэчкі. Да перапынку выступаў т. КАЛІНІН, спатканы зьездам гучнымі воплескамі.

Вячорнае пасяджэньне адчынілася справаздачаю мандатнае камісіі (дакладчык Масквін). Справаздача аднагодна ўхвалена.

Потым цягнуліся спрэчкі па дакладзе т. Молатава. Выступілі т. т. ЭНУКІДЗЭ, КРУПСКАЯ, РАБІНІН (Тамбоў), РОЗІТ (Масква), КІЛІНСКІ (Разань), РУМЯНЦАЎ (Пскоў), АНЦЭЛЁВІЧ, ЗІМІН (Іркуцк). На гэтым вячорнае пасяджэньне скончылася.

*) Даклад даецца скарочаным.

СПРЭЧКІ ПА ДАКЛАДУ тав. МОЛАТАВА.

Прамова т. Калініна.

На ранішнім пасяджэньні партыйнага зьезду 16-га сьнежня ў спрэчках па дакладзе тав. Молатава выступіў т. Калінін.

АПАЗІЦЫЯ Ў СВАІХ ВЫСТУПЛЕНЬНЯХ

хваліцца тым, што нібы Цэнтральны Камітэт вельмі шмат пераняў з яе прапаноў; нядаўняе выступленьне т. Бухарына аб фарсаваньні наступу на кулака і капіталістычныя элемэнты наогул—гэта таксама ёсьць, нібы, заслуга апазіцыі. Але калі гэта ёсьць «заслуга» апазіцыі, дык трэба лічыць, што не яе практычныя прапановы будуць ісьці па лініі таго разуменьня фарсаванага наступу, які разьвіваў т. Бухарын. Я думаю, што, як і заўсёды, апазіцыя ў гэтым пытаньні трапіла пальцам у неба. Трэба сказаць, што ў нас з таварышам Бухарыным перад тым, як выступаць яму на маскоўскім губэрскім зьезьдзе прафсаюзаў, калі ён гэты лёзунг высунуў упяршыню, у нас была з ім гутарка: тав. Бухарын думаў, такім чынам, што ў сучасны момант мы маем параўнаўча больш шырокія матар'яльныя магчымасьці і салідныя палітычныя прадпасылкі для больш узмоцненага, фарсаванага наступу на кулацтва і капіталістычныя элемэнты, камбінуючы гэты наступ па розных напрамках. Але ў чым гэты фарсаваны, ды яшчэ камбінаваны наступ павінен быць? З пункту гледжаньня апазіцыі ўсе наступы павінны быць у тым, каб выпусьціць прымусовую пазыку і зрабіць прымусовае адабраньне хлеба. Гэта яна называе наступам на кулака. Таварышы, ці ёсьць тут што небудзь новае? Гэта ёсьць паўтарэньне 1917 і 1918 г. г. Але тое, што было неабходна, тое, што выплывала з непасрэдных задач у той момант, калі трэба было поруч з гарадзкою буржуазеяю раздушыць ня толькі палітычна, але і ліквідаваць эканамічна кулацтва,—гэтыя захады

НЕЛЬГА ПЕРАНОСІЦЬ МЭХАНІЧНА

ў іншыя абставіны. Аграрная рэвалюцыя, разгром кулака ў 1918 г. уяўляе з сябе вялічэзную клясавую перамогу пралетарыяту і поўпралетарыяту. Аднак, гэта яшчэ ня было перамогаю сацыялістычнае асновы ў нашай тагачаснай эканоміцы. Вось-жа дробная таварная вытворчасьць ня спыняла існаваць. У сучасны момант выступаць з падобнымі мэтадамі, гэта значыць паўтараць 1918 год.

Ці можна спадзявацца, што гэтымі мэтадамі ваеннага камунізму, праз адміністрацыйны зажым, праз экспрапрыяцыю кулацкіх элемэнтаў мы будзем пасоўвацца наперад па шляху самага сапраўднага пераможаньня над кулацтвам. Калі толькі гэтымі мэтадамі мы будзем абмяжоўваць нашую барацьбу з кулацтвам, калі мы будзем кожны год ваенна-камуністычнымі спосабамі «зьнішчаць» кулакоў, пакідаючы старыя ўмовы ўсяго вясковага эканамічнага быту, пакідаючы дробную таварную вытворчасьць і беднасьць сярод сялянства, дык мы такім спосабам кулацтва не пераможам: урэшце будуць зьменьвацца толькі асобы, а адносіны кулацтва застануцца ранейшымі; затое ў значнай меры будуць падарваны ўмовы разьвіцьця вытворчых сіл і парушыцца саюз з серадняком.

Таму, калі тав. Бухарын узьнімаў гэтае пытаньне, ён меў на ўвазе

ПЕРАХОД ДА КАМБІНАВАНАГА НАСТУПУ

ня толькі на кулака, якім ён ёсьць зараз, але і на агульныя ўмовы, якія нараджаюць кулака. Інакш кажучы, бухарынская пастаноўка пытаньня аб фарсаваным наступе на кулака абавязкова мяркуе зьнішчыць тую глебу, на якой расьце кулак. Разам з тым павінна быць узмоцнена барацьба проці кулацтва, як такога, спосабамі, якія мы выпрацавалі ва ўмовах новае эканамічнае палітыкі. **Калі мы ўзьнімем беднату на вышыню поўнага матар'яльна-гаспадарчага дабрабыту, калі мы правядзём гэты ўздым у калектывістычных формах, а не па сыстэме звычайных індывідуальных гаспадарак, дык гэтым будзе зьнішчан грунт, на якім расьце кулак.**

Зараз наш Саюз стаў багацей, у вёсцы мы ўстанавілі досыць добрыя адносіны з серадняком, беднату мы арганізавалі; вось чаму мы можам распачаць фарсаваны наступ на кулака, ня толькі зьмяншаць яго эксплёататарскія імкненьні, але і значна абмяжоўваць яго рост, імкнучыся да поўнае ліквідацыі грунту, які харчуе кулака.

Увесь сёньнешні даклад т. Молатава ўяўляе з сябе доказы, абапёртыя на шматлікія факты, якія падкрэсьліваюць, што мы маем матар'яльную і арганізацыйна-палітычную

МАГЧЫМАСЬЦЬ ДЛЯ ТАКОГА НАСТУПУ.

Наступ ня ў тым, каб гвалтоўна экспрапрыяваць кулака. Мы ведаем, што калі мы толькі гвалтоўна экспрапрыюем кулака Іванава, дык заўтра вырасьце кулак Сапронаў (сьмех). (Гэта выпадковая агаворка). **А патрэбен іменна наступ на самыя ўмовы, якія нараджаюць кулацтва.** Бяспрэчна, таварышы, што такое раскулачваньне адміністрацыйнае, г. зн. гвалтоўнае адабраньне ад кулака сродкаў,—вельмі лёгкі спосаб. Мы добра ўсьвядомілі і ў свой час ужывалі гэты мэтад. А вось што датычыць наступу на кулака новым большым складаным мэтадам, які толькі і можа застрахаваць ад аднаўленьня кулацтва, дык тут мы яшчэ не набылі належнае практыкі. А калі апазіцыя высоўвае свой мэтад, дык яна гэта робіць, з аднаго боку, з дэмагагічных меркаваньняў, а з другога—выкрывае, што ня верыць у будаўніцтва сацыялізму, у сілы гэтага будаўніцтва ня верыць, бо іншых мэтадаў не прапануе.

Заключнае слова т. Молатава.

(На ранішнім пасяджэньні 18 сьнежня).

У сваім заключным слове т. Молатаў спыняецца на асобных пытаньнях, закранутых у спрэчках па дакладзе аб працы партыі на вёсцы.

Закранаючы характарыстыку матар'ялаў аб сацыяльным складзе сялянства, т. Молатаў зазначае, што ў сваім выступленьні т. Асінскі толькі пацьвердзіў правільнасьць зазначэньняў даклада, таму неабходна табліцу ЦСУ, зьмешчаную ў зборніку, выдадзеным да 10-цігодзьдзя Кастрычнікавае рэвалюцыі, як ненавуковую і няправільную па сутнасьці, выняць з карыстаньня. Даныя аб сацыяльным складзе сялянства, якія маюцца ў выніку працы камісіі СНК, хоць і не даюць вычэрпваючага малюнку сацыяльнага складу сялянства, але ў асноўным, бязмоўна, зьяўляюцца правільнымі.

Лёзунг арганізацыі спэцыяльных саюзаў вясковае беднаты, высунуты апазіцыяй, т. Молатаў прызнае няправільным, неадпавядаючым задачам, якія стаяць перад партыяй. Зусім іншы характар носяць „кампезамы", узьнікшыя ў выніку асаблівых гістарычных умоў разьвіцьця рэвалюцыі на Украіне, а таксама асаблівыя формы арганізацыі беднаты ў распубліках Сярэдняе Азіі.

Тав. Молатаў зазначае, што тым вялізным задачам, якія стаяць зараз перад партыяй у галіне вясковае працы, павінна адпавядаць і структура партыйных арганізацый. Арганізацыя пры губкомах, акругкомах і вышэй стаячых партыйных арганізацыях адзелаў па працы на вёсцы зараз зьяўляецца зусім неабходнаю.

Закранаючы пытаньне аб узаемаадносінах між сельсаветамі і вясковымі таварыствамі, т. Молатаў падкрэсьлівае неабходнасьць асьцярожнага падыходу да вырашэньня гэтага пытаньня. Бязумоўна, што зямельныя таварыствы павінны быць падначалены саветам. Аднак, трэба прадбачыць, што кулацтва паспрабуе даць сурёзны адпор правядзеньню мер, накіраваных да ажыцьцяўленьня гэтага падначаленьня. Для таго, каб рэарганізацыя зямельных таварыстваў праходзіла ў спрыяючых умовах, трэба ўзьняць энэргію і ініцыятыву беднаты і серадняковуў.

Тав. Молатаў напамінае яшчэ раз, што асноўнаю задачаю партыі па працы на вёсцы зьяўляецца перавод індывідуальных дробных гаспадарак на сацыялістычныя рэйкі. Зразумела, што гэтая задача будзе вырашана працаю не аднаго году.

Тав. Молатаў зазначае, што сельска-гаспадарчая каапэрацыя мала працуе ў галіне каапэраваньня сялянскіх сродкаў. Бязумоўна, што сялянства дасьць сродкі для разьвіцьця, напрыклад, сельска-гаспадарчае індустрыі, для арганізацыі перапрацоўкі сельска-гаспадарчых прадуктаў, калі мы, зразумела, будзем добрымі гаспадарцамі. Сялянства дасканала разумее, што праз рост сельска-гаспадарчае індустрыі яно можа разьвіць сельскую гаспадарку.

У якасьці аднае з асноўных задач на бліжэйшы пэрыяд часу т. Молатаў высоўвае падцягваньне матар'яльнага і культурнага ўзроўню правінцыі і, асабліва, вёскі. Рост культурнага і матар'яльнага ўзроўню правінцыі будзе адбывацца павольна, але гэта самы верны шлях для стварэньня неабходных умоў, забясьпечваючых пасьпяховасьць нашае працы на вёсцы. У нас і зараз ёсьць на вёсцы сякіятакія сілы, гатовыя аказаць нам дапамогу. Калі мы гэтыя сілы выкарыстаем, калі мы цягнем у справу сацыялістычнага будаўніцтва вёскі беднату і незаможнае сялянства, калі нам удасца зьвярнуць увагу прафсаюзаў, працуючых на вёсцы, на гэтую задачу, дык мы яе, бязмоўна, вырашым.

Прамова т. Молатава сустракаецца гучнымі воплескамі.

* * *

Водпуг прапановы т. Рыкава зьезд ухваляе аднагодна рэзалюцыю па дакладзе т. Молатава за аснову і перадае не для канчатковага зрэдагаваньня ў камісію. У склад камісіі ў ліку іншых таварышоў абраны наступныя таварышы: Молатаў, Пятроўскі, Калінін, Крупская, Сьмірноў, Сырцоў, Дагадаў і інш.

Далей зьезд заслухаў даклад камісіі аб апазіцыі.

Даклад мандатнае камісіі.

МАСКВА. На вячэрнім пасяджэньні 16-га сьнежня партыйны зьезд заслухаў даклад мандатнае камісіі, які зрабіў Масквін. Масквін паведамляе, што мандатная камісія зацьвердзіла 898 рашаючых і 771 дарадчых мандатаў усяго зьезду. Прысутнічае 1.669 дэлегатаў. На 13 зьезьдзе партыі прысутнічала 1164 дэлегаты, на 14-м 1306.

Агульная колькасьць камуністаў, прадстаўленых на зьезьдзе, складае—1.236.190 чал.: членаў партыі 887.233 чал., кандыдатаў—348.957.

На няпоўныя тысячы выдадзена ўсяго 11 мандатаў; на 14-м зьезьдзе такіх мандатаў было выдадзена 22, на 13-м—43. Адзін рашаючы мандат прыпадае на 988 членаў партыі. Дарадчых мандатаў мясцовыя арганізацыі атрымалі 346. Цэнтральным установам дарадчых мандатаў выдадзена 425.

Склад зьезду значна абнавіўся. З усяго ліку рашаючых мандатаў упяршыню бяруць удзел на зьездах партыі 50 проц.

Павялічыўся лік дэлегатаў рабочых ад варстату; па 14-м зьезьдзе гэтая група складала 5 проц., па 15-м яна складае 18,4 проц. Рабочыя ад варстату і незавыя партыйныя прафэсыянальныя працаўнікі складаюць 30 проц. усяго складу рашаючых галасоў зьезду.

У ліку дэлегатаў на зьезьдзе 87,8 проц. складаюць фабрычна-заводзкія кваліфікаваныя рабочыя; сярод іх—57,6 проц. мэталістаў.

Удзельная вага сялян у складзе 15-га зьезду такая-ж, як і на 14-м зьезьдзе.

Удзельная вага групы служачых 23,3 проц. менш удзельнай вагі 14-га зьезду, дзе ўдзельная вага складала 39,9 проц. Сярод групы служачых маецца 52,9 проц. падпольнікаў, сярод іх пераважная большасьць з дакастрычнікавым стажем.

Прамова т. Энукідзэ.

Энукідзэ лічыць асноўнымі цяжкасьцямі працы партыі на вёсцы вялікую рознастайнасьць умоў разьвіцьця вёскі. Аднак, не зважаючы на гэтыя цяжкасьці 33 вялізныя дасягненьні ў справе разьвіцьця сельскае гаспадаркі, якія зьяўляюцца вынікам правільнае палітыкі партыі на вёсцы.

Прамова т. Крупскае.

Крупская зазначае, што пераход дробных індывідуальных гаспадарак да буйных калектывістычных можа быць праведзен толькі пры ўмове культурнага росту сялянства. Шматлікія факты, якія маюцца ў нас, сьведчаць што сучасная вёска, асабліва яе беднацкая і серадняцкая часткі, маюць вялікую цягу набыць веды і імкненьне да культурнагага разьвіцьця. Нажаль мы ў гэтай галіне ня можам пахваліцца значнымі посьпехамі. Сетка палітасьветы далёка не ахапляе вёску. Вялікая колькасьць сёл і вёсак застаецца яшчэ бяз уплыву палітасьветы. Мы не змаглі даць вёсцы патрэбную кніжку. Большасьць вясковых бібліятэк складаецца з кніжак ранейшых панскіх бібліятэк. Нашая праца па вывучаньні дзяцей таксама адстала ад патрабаваньняў сялянства.

* * *

Пасьля Крупскае выступалі: **Рабінін** (Тамбоў), **Розіт** (Масква), **Гілінскі** (Масква), **Румянцаў** (Пскоў), **Анцілёвіч** (Усепрацэмлес), **Зімін** (Іркуцк).

Пасьля прамовы Зіміна абвяшчаецца перапынак да наступнае раніцы.

ПРЫВІТАНЬНЕ ЗЬЕЗДУ ДЭЛЕГАТАМІ БЕСПАРТЫЙНЫХ РАБОЧЫХ.

На ранішнім пасяджэньні 17 сьнежня партзьезд слухае вітаньні дэлегатаў ад рабочых фабрык і заводаў.

Зьезд вітаюць **Ступін—ад саратаўскага заводу «Унівэрсаль», ад горнарабочых Прыволжскай акругі Шэўчэнка ад імя горнарабочых Донбаса і Сіноўскі ад маскоў

XV ЗЬЕЗД УСЕСАЮЗНАЙ КАМПАРТЫІ (б).

Паведамленьне тав. Арджанікідзэ пра вынікі працы зьездаўскае камісіі па справах апазіцыі.

Тав. Арджанікідзэ паведамляе, што абраная зьездам камісія ўважліва вывучыла ўсе дакуманты адносна дзейнасьці апазіцыі. Камісія з поўнай выразнасьцю ўстанавіла наяўнасьць у апазіцыі свайго ЦК, абласных, губэрскіх, гарадзкіх і райённых цэнтраў, тэхнічнага апарату, органаў друку і г. д.

За межамі апазіцыя зьвязалася ня толькі з фракцыйнымі групамі антыленінскага напрамку, якія маюцца ўнутры партыі Камінтэрну, але і з арганізацыямі і асобамі, ніколі да Камінтэрну не належачымі, а таксама з выключанымі з Камінтэрну, напрыклад з групаю Маслава, Рут-Фішэр, Корша, Суварына і інш.

Такая арганізацыйная пазіцыя прывяла да таго, што ўнутры СССР апазіцыя зьвязалася з беспартыйнымі буржуазнымі інтэлігэнтамі (Шчарбакоў і інш.), у сваю чаргу зьвязанымі з адкрытымі контр-рэвалюцыянэрамі, а за межамі СССР апазіцыя атрымала шырокае падтрыманьне з боку буржуазеі ўсіх краёў.

У апошні час, ужо ў часе працы зьезду, ад апазіцыі паступіла тры дакумэнты. Першы дакумэнт паступіў 3-га сьнежня за подпісам 121 актыўнага дзеяча апазіцыі. У гэтым дакумэнце апазіцыя ня толькі не адмаўлялася ад сваіх памылак, а наадварот, дамагалася прапаганды сваіх меншавіцкіх поглядаў.

Пасьля ўхвалы зьездам рэзалюцыі па справаздачах ЦК, у якой прыналежнасьць да апазіцыі была абвешчана несумясьцімаю з прыналежнасьцю да партыі, у камісію паступіла яшчэ два дакумэнты ад апазіцыі: адзін за подпісам Ракоўскага, Муралава і Радэка, а другі за подпісам Каменева, Бакаевы, Еўдакімава і Аўдзеева. Група, падпісаўшая першы дакумэнт, застаючыся пры сваіх поглядах, бароніць сваё права на прапаганду. Другая група ў сваёй заяве захоўвае свае меншавіцкія погляды, пры адмове ад іх прапаганды.

Камісія, абмеркаваўшы падрабязна зьмест гэтых дакумантаў, знайшла іх зусім нездавальняючымі, супярэчачымі рэзалюцыі, ухваленай зьездам па справаздачы ЦК. Камісія лічыць, што мы ня маем права дазволіць прапаганду меншавіцкіх поглядаў унутры партыі. Адмова ад прапаганды гэтых поглядаў, чры сьцьвярджэньні іх правільнасьці, якая маецца ў заяве, падпісанай Каменевым, Бакаевым, Еўдакімавым і Аўдзеевым, таксама пераконвае нас у тым, што і гэтая група ня лічыць неабходным ідэёва разброіцца.

Камісія прапануе зьезду выключыць з партыі актыўных дзеячоў трацкісцкае апазіцыі ў ліку 75 чалавек, а таксама выключыць з партыі групу Сапропава, як выразна антыпрывалюцыйную, у ліку 23 чалавек.

Адначасова з выключэньнем актыўных апазіцыянэраў, партыя павінна зрабіць усё, каб сумленныя працаўнікі—члены партыі, падпаўшыя пад тых ці іншых прычынах пад уплыў апазіцыі, былі вызвалены ад гэтага ўплыву і засталіся ў партыі.

Тав. Арджанікідзэ чытае тэкст рэзалюцыі, ухваленай камісіяю зьезду па справах апазіцыі, і прапануе гэту рэзалюцыю ўхваліць.

Выступленьне т. Сьмілгі.

Пасьля дакладу т. Арджанікідзэ Сьмілга агалашае заяву ад свайго імя, а таксама ад імя Муралава, Ракоўскага і Радэка, у якой яны гавораць, што, не адмаўляючыся ад сваіх поглядаў і перакананьняў, яны як і раней „будуць змагацца за адзінства партыі». Сьмілга скончыў сваю заяву прапановаю адхіліць праэкт рэзалюцыі, запрапанаванае зьезду камісіяй па справах апазіцыі.

З адказам на выступленьне Сьмілгі выступіў т. **КАЛІНІН**, спатканы воплескамі зьезду, якія перайшлі ў бурную авацыю. Дэлегаты ўстаюць са сваіх месц і крычаць «ура».

Выступіўшы пасьля прамовы тав. Калініна т. **УГАРАЎ** (Ленінград) падкрэсьліў правільнасьць рэзалюцыі, запрапанаванай камісіяю, і зазначыў па неабходнасьць яе ўхваленьня.

Тав. **АРДЖАНІКІДЗЭ** адмовіўся ад заключнага слова, выказаўшы ўпэўненасьць, што лепшым адказам на выступленьне Сьмілгі будзе аднагалосна ўхваленая зьездам запрапанаваная камісіяю рэзалюцыя.

ЗЬЕЗД АДНАГАЛОСНА ЎХВАЛЯЕ РЭЗАЛЮЦЫЮ, ЗАПРАПАНАВАНУЮ КАМІСІЯЮ ЗЬЕЗДУ ПА СПРАВАХ АПАЗІЦЫІ.

Пасьля ўхваленьня рэзалюцыі дэлегаты зьезду ўстаюць са сваіх месц і пяюць „Інтэрнацыянал».

Канец ранішняга пасяджэньня 18 сьнежня зьезд прысьвечвае выбару кіруючых устаноў партыі: ЦК і ЦКК.

Рэзалюцыя аб трацкісцкай апазіцыі.

Ухвалена аднагалосна.

15-ты зьезд, заслухаўшы даклад камісіі, якая дакладна вывучыла ўсе матар'ялы апазіцыі, сьцьвярджае наступнае:

1. Апазіцыя ў галіне ідэалёгічнай ад рознагалосьсяў тактычнага характару перайшла да рознагалосьсяў праграмнага характару, рэвізуючы погляды Леніна і адышоўшы да пазіцыі меншавізму. Адхіленьне магчымасьці пераможнага будаўніцтва сацыялізму ў СССР і, значыць, адхіленьне сацыялістычнага характару нашае рэвалюцыі; адхіленьне сацыялістычнага характару дзяржаўнае прамысловасьці; адхіленьне сацыялістычных шляхоў разьвіцьця на вёсцы ва ўмовах пралетарскае дыктатуры і палітыкі саюзу пралетарыяту з асноўнымі масамі селянства на базе сацыялістычнага будаўніцтва, урэшце, фактычнае адхіленьне пралетарскае дыктатуры ў СССР (тэрмідор) і зьвязанае з гэтым капітулянцтва і паражэнцтва—усё гэта абярнула апазіцыю ў выяўленьні ідэалёгіі сацыял-дэмакратыі ўнутры СССР і ў дапаможны атрад міжнароднае сацыял-дэмакратыі за яго межамі.

2. У галіне тактычнай апазіцыя, узмацняючы і абвастраючы сваю працу проці партыі, перасягнула межы ня толькі статуту партыі, але і межы савецкае лёгальнасьці (нелёгальныя сходы, нелёгальныя друкарні, нелёгальныя органы друку, гвалтоўніцкі захоп памяшканьняў і г. д.). Завяршэньнем гэтае антысавецкае тактыкі быў пераход да адкрытае барацьбы проці рэжыму пралетарскае дыктатуры, да наладжаньня вулічных дэманстрацый проці партыі і савецкага ўраду 7-га лістапада 1927 г. Антысавецкая тактыка апазіцыі, ужываемая і загранічаю, зьвязаная з прапагандаю і кампаніяй паклёпаў проці СССР, фактычна паставіла апазіцыю побач з адкрытымі ворагамі праю дыктатуры пралетарыяту.

3. У галіне арганізацыйных пытаньняў апазіцыя, абапіраючыся на рэвізію ленінскіх поглядаў, ад фракцыйнасьці перайшла да заснаваньня сваёй уласнай трацкісцкай партыі. Камісія вынесла з поўнаю відавочнасьцю наяўна ў апазіцыі свайго цэнтральнага камітэту, вабласных, губэрскіх і гарадзкіх цэнтраў, тэхнічнага апарату, членскіх узносаў, друкаваных органаў і інш. і інш. Загранічаю трацкісцкая партыя зьвязалася ня толькі з фракцыйнымі групамі антыленінскага напрамку, якія маюцца ўнутры партый Камінтэрну, але і з арганізацыямі, групамі і асобнымі асобамі, ніколі да Камуністычнага Інтэрнацыяналу не належачымі, а таксама і з выключанымі з Камінтэрну ворагамі і здрадніками камуністычнага руху (Маслаў, Рут Фішэр, Корш, Суварын, Росмэр, Роланд, Гольст, Лібэр і г. д. і інш.).

Такая арганізацыйная практыка апазіцыі прывяла да таго, што ўнутры СССР апазіцыя зьвязалася з беспартыйнымі буржуазнымі інтэлігэнтамі (Шчарбакоў і інш.) у сваю чаргу зьвязанымі з адкрытымі контр-рэвалюцыянэрамі, а за межамі СССР атрымала шырокае падтрыманьне з боку буржуазеі ўсіх краёў.

Грунтуючыся на вышэйвыкладзеным, 15-ты зьезд лічыць, што ЦК і ЦКК зрабілі правільна, выключыўшы Трацкага і Зіноўева 14-га лістапада 1927 г. з шэрагаў УсеКП(б), а іншых апазіцыйных членаў ЦК і ЦКК з складу гэтых апошніх і паставіўшы пытаньне аб апазіцыі ў цэлым на абмеркаваньне зьезду. Зьезд у сваёй рэзалюцыі па справаздачы ЦК заявіў, што прыналежнасьць да трацкісцкае апазіцыі і прапаганда яе погляду зьяўляюцца несумясьцімымі з прыналежнасьцю да УсеКП(б).

Зьезд лічыць у зьвязку з гэтым, што апазіцыя павінна разброіцца і ідэёва і арганізацыйна, рашуча зганьбіўшы выкладзеныя вышэй яе погляды, як антыленінскія, як меншавіцкія, і ўзяўшы на сабе абавязацельства бараніць погляды і пастановы партыі, не зьезду, не канфэрэнцыі і не ЦК.

Апазіцыя, аднак, адхіліла гэтае патрабаваньне партыі. У дакумэнце апазіцыі ад 3-га сьнежня 1927 г. за подпісам 121 актыўнага дзеяча апазіцыі, апазіцыя ня толькі не адмаўляецца, а, наадварот, дамагаецца прапаганды сваіх меншавіцкіх поглядаў.

Пасьля ўхвалы зьездам рэзалюцыі па справаздачы ЦК у камісію пададзены два дакументы апазіцыі ад 10-га сьнежня 1927 г., з якіх адзін за подпісамі Ракоўскага, Муралава і Радэка дамагаецца на тольки захаваньня гэтых меншавіцкіх поглядаў, але і неабходнасьці іх прапаганды, а другі за подпісам Каменева, Бакаева, Еўдакімава і Аўдзеева настойвае на захаваньні меншавіцкіх поглядаў апазіцыі пры адмове ад іх прапаганды, што пярэчыць патрабаваньню ідэёвага разброеньня і азначае адмову ад абароны пастаноў партыі.

Сьцьвярджаючы выразную супярэчнасьць між двума апазіцыйнымі групамі, зьезд лічыць разам з тым абедзьве заявы апазіцыі зусім нездавальняючымі.

Грунтуючыся на вышэйвыкладзеным і бяручы пад увагу двухразовае парушэньне апазіцыяй ве ўрачыстых абяцаньняў аб адмове ад фракцыйнасьці, зьездам пастанаўляе:

1. Выключыць з партыі актыўных дзеячоў трацкісцкае апазіцыі:

1) Аўдзеева Івана, 2) Аляксандрава А., 3) Аўсэма, 4) Бакаева Івана, 5) Баташова А., 6) Баранава С., 7) Багуслаўскага М., 8) Будзінскую, 9) Вагаяна, 10) Вардзіна, 11) Врачова І., 12) Герцыка, 13) Гесена С., 14) Гардона М., 15) Гуральскага А., 16) Дзьмітрыева П., 17) Дробніца, 18) Еўдакімава Г., 19) Залуцкага П., 20) Зорына С., 21) Ільліна, 22) Каўтарадзэ С., 23) Кагаліна, 24) Каменева Л., 25) Каспараву Б., 26) Каспэрскага, 27) Каталынава, І. Н., 28) Кавалеўскага, 29) Камандора, 30) Канькову А., 31) Кастрыцкага, 32) Красоўскую М., 33) Куклліна А., 34) Лашэвіча М., 35) Левіна В., 36) Лелазола П., 37) Лідзіна, 38) Ліліну В., 39) Лабанава Г., 40) Лубіна Г., 41) Мунічова А., 42) Муралава Н., 43) Натансона М. Я., 44) Мікалаева М., 45) Паульсона, 46) Пэтэрсона, А., 47) Піташко, 48) Панамарова В., 49) Пятакова Ю., 50) Равіч О., 51) Радэка К., 52) Ракоўскага, 53) Рафаіла Р., 54) Рэйнгольда І., 55) Румянцава, 56) Сафарава, 57) Сенькова В., 58) Сьмілгу І., 59) Сьмірнова Івана Мікітавага, 60) Сокалава, 61) Салаўёва, К., 62) Сасноўскага Л., 63) Тарасава І. І., 64) Тартакоўскую С., 65) Тарханава О., 66) Тужыкава, 67) Уконец, 68) Фёдарава, 69) Філінава І., 70) Форціна, 71) Харытонава, 72) Чарнова, 73) Шапшалёву М., 74) Эшба Е.

2. Выключыць з партыі групу Сапронова, як выразна антыпрывалюцыйную:

1) Бальшакова А., 2) Варгузава Ф. Е., 3) Дуиэ, 4) Емельянава (Каліна), 5) Заварню, 6) Кірылава, 7) Мікліна, 8) Міно, 9) Мінькова, 10) Аборына, 11) Пенько, 12) Піліпенка, 13) Праняева, 14) Пуціліна, 15) Сьлідовкера, 16) Сьмірнова В., 17) Сьмірнова М., 18) Строганава, 19) Ціханава, 20) Усьцінчыка, 21) Харычка, 22) Чэрсанава, 23) Шрэйбера.

3. Даручыць ЦК і ЦКК ужыць усе захады ідэёвага ўзьдзейнічаньня на радавых членаў трацкісцкае апазіцыі з мэтаю іх пераканаўня пры адначасным ачышчэньні партыі ад усіх яўна несправяльных элемэнтаў трацкісцкае апазіцыі.

5-цігадовы плян гаспадарчага будаўніцтва СССР.

Заключнае слова тав. Рыкава.

(На ранішнім пасяджэньні 16 сьнежня).

Са спрэчак, якія адбыліся па дакладах маім і т. Кржыжаноўскага,—сказаў Рыкаў,—мне здаецца належыць зрабіць вывад, што **15 зьезд ухваляе прапановы ЦК абмежавацца на гэтым зьезьдзе наказам для складаньня пяцігадовага плану.**

Прабелам у спрэчках зьяўляецца тое, што ў іх было выдзелена мала месца пытаньням кан'юнктуры бягучага году.

АСНОЎНАЯ ЦЯЖКАСЬЦЬ

у гаспадарчым становішчы ў сучасны момант датычыць не ўсяго таваразвароту між горадам і вескаю, а толькі часткі—іменна, хлебазагатовак. Але гэтая частковая цяжкасьць можа вырасьці ў агульны гаспадарчы крызіс. Калі мы ня зможам хоць-бы на працягу будучых пяці год даць хлеб у райёны вырабу бавоўны, лёну і райёны лесазагатовак, дык гэтым будуць падарваны такія гаспадарчыя элемэнты, ад якіх залежыць стан усяе гаспадаркі ў цэлым. Таму ізноў сьцьвярджаю небясьпеку, зьвязаную з нездавальняючым ходам хлебазагатовак, небясьпеку, якую трэба зьліквідаваць магчыма хутчэй. У пяцігадовым пляне неабходна прадугледзіць дадатковыя меры дзеля разьвіцьця збожжавых культур.

Пытаньні разьвіцьця сыравіннае базы прамысловасьці і дастаўкі хлеба маюць вялікую сувязь з разгортваньнем лёгкае індустрыі. Стварэньне на тэрыторыі СССР шырокае сыравіннае базы нам неабходна для больш шпаркага разьвіцьця прамысловасьці. Пасьля дакладу я атрымаў запіску, у якой аўтар хоча, каб зьезд забараніў пераразьмеркаваньне сродкаў між лёгкаю і цяжкаю прамысловасьцю ў карысьць апошняе. Водгук маёй думкі, гэтая дырэктыва ня можа быць ухвалена, як і дырэктыва забароны пераразьмеркаваньня сродкаў між сельскаю гаспадаркаю і прамысловасьцю. Ухваленьне дырэктывы аб забароне пераразьмеркаваньня сродкаў між лёгкаю і цяжкаю індустрыяю азначала-б вялізарны ўдар цяжкай прамысловасьці, а разам з тым усёй справе індустрыялізацыі гаспадаркі, разьвіцьцё якое ў гэтай стадыі ў вялікай ступені залежыць ад узмацненьня цяжкае індустрыі, у прыватнасьці, машынабудаўніцтва.

У спрэчках шмат гаварылася пра

НЕДАХОПЫ КАПІТАЛЬНАГА БУДАЎНІЦТВА.

Зараз зьяўляецца мэтазгодным зьвярнуць увагу іменна на недахопы, шырока іх асьвятліць, раскрытыкаваць, каб як мага хутчэй зьнішчыць. З прычыны выключнага значэньня цяжкасьці гаспадарчае працы гэтая крытыка ў сучасны момант зьяўляецца абавязковаю. Маецца шмат прыкладаў дрэннае праэктыроўкі новых прадпрыёмстваў і дрэннае арганізацыі працы новых набудоў, нарэшце, слабога выкарыстаньня таго, што ўжо набудавана, перавышэньня кошту новага будаўніцтва ў параўнаньні з першапачатковымі заляўкамі. Дзякуючы таму, што мы першапачаткова намячаем набудаваць той ці іншы завод за тры мілёны руб., а потым у працэсе працы выходзіць, што гэты завод будзе каштаваць ня тры, а пяць-шэсьць мілёнаў, мы спатыкаем вялікія фінансавыя перашкоды. Тут капітальныя выдаткі да 5-цігадовага пляну запраэктаваны ў разьмеры да 25 міліярдаў руб. (ва ўсе галіны гаспадаркі па дзяржсэктары). Пры гэтым маюцца сьляды, што на гэтыя сродкі будзе набудавана пэўная колькасьць новых заводаў, чыгунак, элеватараў і інш. Дазволім сабе падумаць, што ў працэсе набудовы кошт усіх гэтых набудоў павялічыцца ў паўтары-два разы. Усё гэта будзе азначаць, што для выкананьня пяцігадовага пляну працы нам трэба будзе выдаць не 25 міліярдаў, а ў паўтары разы большую суму, г. зн. 40-50 міліярдаў руб. Міліярды на вуліцы не валяюцца. Гэта будзе азначаць зрыў пяцігадовага пляну, бо мы або павінны будзем знайсьці дзесяткі міліярдаў новых сродкаў, г. зн. у вялікай ступені павялічыць адабраньне нацыянальнага прыбытку (а гэта немагчыма), або спыніць значную частку распачатае працы. Гаспадарцы іншы раз скардзяцца на несвачаснае фінансаваньне новага будаўніцтва. Перавышэньне кошту будаўніцтва ў параўнаньні з першапачатковымі заляўкамі іншы раз тлумачыцца нязвычайна лёгкадумнымі адносінамі да справы. Пачынаючы з 15-га зьезду трэба, каб усе грунтаваліся на тым, што разыходзіны між каштарысамі і фактычным коштам будаўніцтва партыя будзе разглядаць, як злачынства і будзе аддаваць за гэта пад суд. (Воплескі).

Некалькі слоў

АБ АДКАЗНАСЬЦІ НАШЫХ ГАСПАДАРЦАЎ

за выконваемую імі працу. На чале пераважнае большасьці гаспадарчых арганізацый стаяць у сучасны момант камуністы. У большасьці выпадкаў яны ня маюць тэхнічнае адукацыі і патрэбных тэхнічных ведаў. Тым ня менш яны часта лічаць магчымым браць на сябе адказнасьць і за вырашэньне тых ці іншых спэцыяльных тэхнічных пытаньняў. Мне здаецца, што гэта самы лепшы мэтад унесьці поўную безадказнасьць у справу. Гаспадарца-кіраўнік павінен арганізаваць справу так, каб за тэхніку адказваў тэхнік, каб за плян пабудовы якое-небудзь фабрыкі, які падасьцца на зацьверджаньне вышэйшых органаў, адказваў той тэхнік, спэцыяліст, прафэсар, які яго складаў. У нас завёўся цяпер вельмі шкодны звычай; нашыя адказныя працаўнікі, у тым ліку наркомы вельмі шмат падпісваюць чужога і вельмі мала ўносяць свайго (галасы—«правільна», воплескі). Цэлая сыстэма кіраўнікоў справамі, сэкратароў, вучоных і навучоных спэцыялістаў, намесьнікаў даюць на подпіс таму ці іншаму адказнаму працаўніку вялікую колькасьць папер. І ён думае, што робіць вялікую справу, калі сядзіць на чале сыстэмы папяровага дзеловодзтва, штампалюе падаваемыя яму паперы, праэкты, пастановы, адносьнікі і інш. (сьмех). Нічога, апрача фактычнае безадказнасьці з такіх парадкаў ня выходзіла і выйсьці ня можа (галасы—«правільна», воплескі). Трэба кожнага адказнага працаўніка, кожнага працаўніка наогул ацэньваць не па колькасьці чужых думак і прапаноў, якія ён механічна падпісаў, а па тым, як шмат ён уносіць у справу свайго, як арганізаваў для працы сваіх супрацоўнікаў і якую адказнасьць на кожнага з іх укладаў (галасы—«правільна», воплескі).

У канцы яшчэ некалькі слоў

АДНОСНА ПЯЦІГАДОВАГА ПЛЯНУ,

тэмпу сацыялістычнага будаўніцтва. Пяцігадовы плян, гэта—канкрэтная праграма будаўніцтва сацыялізму, праграма, навакол якое на працягу бліжэйшых гадоў павінны быць мабілізаваны ўсе сілы, усе сродкі. Трэба сабе поўнасьцю ўявіць, што тэмп разьвіцьця гаспадаркі ў нашых умовах у вялікай меры залежыць ад якасьці ўсяе працы. Таму асабліва неабходна тут самакрытыка. Да 15-га зьезду мы прышлі з вялікімі дасягненьнямі ў галіне гаспадаркі, але наўрад ці можна спрачацца проці таго, што пры лепшай працы можна было-б дасягнуць большых посьпехаў. Неабходна ў працэсе працы мець на ўвазе кожную сваю памылку, вучыцца на ёй, выпраўляць яе, не дапушчаць паўтарэньня тых-жа памылак у іншых галінах працы. Тады дасягнем максымальнага тэмпу будаўніцтва сацыялістычнае грамады. (Доўгія воплескі; дэлегаты стоячы вітаюць Рыкава).

* * *

19-га сьнежня на ранішнім пасяджэньні партзьезду былі абвешчаны выніні выбараў у ЦК і ЦКК УсеКП(б).

Далей з заключнаю прамоваю выступіў тав. Рыкаў, пасьля чаго зьезд зачыніўся.

У Саюзе ССР.

Гадавіна ВЧК-АДПУ ў Ленінградзе.

ЛЕНІНГРАД, 17-12. У адзнаку 10-пігодзьдзя ВЧК-АДПУ прэзыдыум Ленінградзкага Савету і абласны выканком пастанавілі наладзіць урачыстае пасяджэньне супольна з працаўнікам ДПУ і паднесьці Ленінградзкай АДПУ ад імя Ленінградзкага Савету чырвоны сьцяг і асобнае вітаньне.

Сьвяткаваньне дзесяцігодзьдзя па СССР.

МАСКВА. Адусюль паведамляюць аб сьвяткаваньні 10-ых угодак ВЧК—ДПУ.

У **Вехня - Удзенску** бурацкі ЦВК узнагародзіў бурата-мангольскую ДПУ сьцягам і перадаў грамату.

Ва Ўладывастоку адбылося ўрачыстае пасяджэньне савецкіх, партыйных і прафсаюзных арганізацый супольна з працаўнікамі ДПУ, а таксама рабочымі і вайсковымі часьцямі. У рэзалюцыях, ухваленых на фабрыках і ўстановах, зазначана, што ДПУ зьяўляецца лепшым абаронцаю працоўных. Узнагароджаныя акрыканкомам супрацоўнікі ДПУ узялі падарункі за свой кошт. Грошы пойдуць у фонд танкавага атраду імя Дзяржынскага.

У Новасібірску краявы камітэт УсеКП зьвярнуўся з шчыраю бальшавіцкаю вітаньню да адважных абаронцаў пралетарскае дыктатуры.

У Казані сьвяткаваньне адбылося з вялікім уздымам пры ўдзеле шырокіх мас рабочых. На ўрачыстым пасяджэньні партыйных, савецкіх і грамадзкіх арганізацый гучнымі воплескамі была ўхвалена прапанова перадаць усе сродкі, прызначаныя на падарункі працаўніком ДПУ, у фонд аўта-бранявога атраду імя Дзяржынскага.

Аб сьвяткаваньні паведамляюць таксама з **Сэвастопалю, Сымфэропалю, Кіева і іншых гарадоў.**

У Маскву едзе віконт Гото.

НОВАСІБІРСК. Прыехала японская дэлегацыя на чале з віконтам Гото. На вакзале ў Новасібірску дэлегацыю спаткалі прадстаўнікі краявое і акруговае савецкае ўлады. Гото выказаў удзячнасьць за шчырае спатканьне і надзею на большае зьбліжэньне і далейшае ўзмацненьне сувязі між СССР і Японіяй.

«Адзнакі шчыльнага зьбліжэньня між абодвымі краямі,—заявіў Гото,—ужо ёсьць. Гэтую сувязь мы будзем узмацняць і ў далейшым».

Першыя падарожныя ўражаньні Гото надзвычайна добрыя. Гото мае намер прабыць у Маскве і Ленінградзе блізка 2-х тыдняў.

Год працы волхаўскае станцыі.

ЛЕНІНГРАД, 16-XII. 18 сьнежня мінае год з часу эксплёатацыі Волхаўбуду. За першы год працы Волхаўбуду сілавая ўстаноўка выпрацавала 180,2 мілёны кілёват гадзін. Выпрацаваная на гідрастанцыі энэргія ўжо ў працягу году зьменшыла прыход апалу ў колькасьці 150 тысяч тон, ці 9,16 мільёнаў пудоў. З 8 мі генэратараў, якія маюцца на Волхаўбудзе, 4 былі зроблены заграніцаю, а 4 на расейскіх заводах, прычым у часе выпрабаваньня расейскія генэратары аказаліся ня толькі ня горшымі ад заграніччных, але нават у некаторых частках значна лепшымі.

Водгук праграмы будучага году Волхаўская станцыя павінна выпрадаваць 240 мілёнаў кілёват гадзін, што дасьць эканомію для ленінградзкае прамысловасьці каля 13,5 мілёнаў пудоў высока-калёрыйнага апалу.

Кастрычнікавы прызыў у Грузіі.

ТЫФЛІС. Ад 8-га лістапада да 8-га сьнежня ў тыфлійскую партыйную арганізацыю пададзена 1091 заява аб прыёме ў партыю. 663 ужо прыняты кандыдатамі.

ВОДГУК НА КІТАЙСКІЯ ПАДЗЕІ СЯРОД ПРАЛЕТАРЫЯЎ ЛЕНІНГРАДУ.

ЛЕНІНГРАД. Апошнія падзеі ў Кітаі выклікалі гарачы водгук на ленінградзкіх фабрыках і заводах. Выступаўшыя на лятучых мітынгах прамоўцы-рабочыя ў сваіх прамовах адзначылі правакацыйную палітыку наёмнікаў міжнароднага імпэрыялізму ў Кітаі.

Нота савецкага ўраду выклікала поўную аднадушную ўхвалу з боку ўсіх рабочых.

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1 гадз. уночы).

Пленум нааабранага ЦК УсеКП(б).

19 сьнежня 1927 г. адбыўся пленум выбранага на 15 зьезьдзе ЦК УсеКП(б) з удзелам членаў прэзыдыуму ЦКК і членаў цэнтральнай рэвізійнай камісіі.

Пленум выбраў выканаўчыя органы ЦК у гэткім складзе:

Членамі Палітбюро—т. т. Бухарын, Варашылаў, Калінін, Куйбышаў, Молатаў, Рыкаў, Рудзутак, Сталін, Томскі.

Кандыдатамі ў члены Палітбюро—т. т. Пятроўскі, Угланаў, Андрэеў, Кіроў, Мікаян, Кагановіч, Чубар, Касіёр С. Т.

Сэкратарамі ЦК абраны—т. т. Сталін, Молатаў, Угланаў, Касіёр С. Т. і Кубяк.

Кандыдатамі ў гэткім сэкратарычту зацьверджаны т. т. Москвін, Бубноў, Арцюхіна.

Генэральным сэкратаром ЦК УсеКП(б) пленум зацьвердзіў тав. Сталіна.

Огрбюро ЦК зацьверджана г зусім складзе: члены огрбюро т. т. Сталін, Молатаў, Угланаў, Касіёр, С. Т., Кубяк, Москвін, Бубноў, Арцюхіна, Андрэеў, Дагадаў, Смірноў А. П., Рухімовіч, Сулімаў.

Кандыдаты ў члены огрбюро—т. т. Лобаў, Міхайлаў, Лепса Чаплін, Шмідт, Уханаў, Котаў.

Адказным рэдактарам ц. о. партыі «Правда» пленум зацьвердзіў тав. Бухарына.

ЦЭНТРАЛЬНЫЯ ОРГАНЫ УсеКП(б).

Члены Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б): Акулаў, Андэеў, Аншпаў, Арцюхіна, Бадаеў, Баўман, Бубноў, Бухарын, Варашылаў, Камарнік, Галашчакін, Дагадаў, Жукаў, Зяленскі, Кабакоў, Кагановіч, Калінін, Квілінг, П. І., Кіргіш, Кіраў, Енорын, Калаціла́ў, Камароў, Касіёр, І. В., Касіёр, С. В., Котаў, Кржыжаноўская, Крупская, Кубяк, Кулікаў, Куйбышаў, Лепсэ, Лобаў, Ломаў, Любімаў, Мануільскі, Мядзьведзеў, Менжынскі, Мікаян, Міхайлаў, Молатаў, Москвін, Арахелашвілі, Пятроўскі, Г. І., Постышаў, Пятніцкі, Рудзутак, Румянцаў, І., Рухімовіч, Рыкаў, Скрыпнік, Сьмірноў, А. П., Сакольнікаў, Сталін, Сьцяпанаў-Скварцоў, Стэцкі, Стрыеўскі, Сулімаў, Сырцоў, Талаконцаў, Томскі, Угараў, Угланаў, Уханаў, Цюрупа. Чычэрын, Чубар, Чудоў, Шварц, С., Швэрнік і 71-ы Шмідт В.

Кандыдаты ў члены Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б): Аляксееў, Румянцаў, Мусабекаў, Уншліхт, Чуцкаеў, Калгушкін, Урываеў, Ікрамаў, Кісялёў, Мірзаян, Міхайлаў, Іваноў, Ціхон, Баранаў, Градзінскі, Эйхе, Іваноў Б., Брухаеаў, Латацкоў, Катацкі, Собалеў, Чаплін, Каадрацеў, Маркаў, Сухамлін, Жданаў, Калыгіна, Хатаевіч, Строганаў, Крывіцкі, Ляонаў, Сяменаў, Палонскі, Анцэловіч, Чувырын, Гей, Посаў, Эліава, Варэйкіс, Мельнічанскі, Межлаук, Ламінадзе, Ошвінцаў, Рынгін, Камінскі, Кліменка, Руціи, Эсінскі, Мікалаева, Лазоўскі і 50-ы—Сераброўскі.

Цэнтральная рэвізійная камісія УсеКП(б): Уладзімірскі, Сьцяпанаў, Ярэвіч, Быкін, Лядаў, Багданаў, Лепа, Рабоў, Рабінін.

Члены ЦКК УсеКП(б): Алякеева, Амірханян, Антонаў, В. Г., Антонаў, Афанасьеў, Бармашова, Бауэр, Бахціна, Беленькі З. М., Багданаў І. Е., Багданаў, Борыин, Булін, Буссэ, Васільеў, Бэйбэрг, Вікман, Віксьнін, Вішнякова, Вожжаў, Галеєў, Галіева, Галушкін, Герасімаў, Гольцман, Ганчароў, Гарчаеў, Гаршкоў, Грачанны, Грыгор'ева, Гросман, Грузэль, Грэзеў А. М., Грэзеў, Гурэвіч, Гусеў, Дзесаў, Дзірык, Долідзе, Дзюжаў, Яўрэінаў, Ягораў, Ялізараў, Энукідзэ, Жданаў Завіцкі, Загрэбенны, Зайцаў Г. А., Зайцаў Г. Н., Зайцаў, Зангвіль, Затонскі, Зямлячка, Ільлін, Кагановіч, Калашнікаў, В.С., Калашнікаў М. І., Калмановіч, Калнін, Караваеў, Карасеў, Карымаў, Кары-куміеў, Карпаў, Кліноў, Клюеў, Кніга, Кабылін, Кавалёў, Кажэўнікаў, Казлоў, Каковіхін, Колабаў, Камісараў, Кандрацьеў, Кананенка, Копань, Копеў, Карасьцелеў А. А., Карасьцелеў Г. А., Караткоў, Косароў, Крывоў, Крыленка, Кузьмін, Кузьміна, Курдзябаеў, Курскі, Кучченка, Ладожын, Ларын, Ларачаў, Лебедзеў, Лебедзь, Левіцін, Лежава, Лендник, Лісіцын, Лакатскоў, Лычаў, Ляксуткін, Магір, Мазураў, Майораў, Максеў, Мальцаў, Манжара, Марцікін, Мартынавіч, Махарадзе, Мядзьведзеў, Мільчакоў, Мілюцін, Мітрафанаў, Майсеева, Мораз, Марозаў, Муранаў, Муценак, Назарыцын, Назараў, Носіраў, Хайдула, Нікіцін, Ніканораў, Новасёлаў, Арджанікідзе, Астроўскі, Асьмоў, Паўлуноўскі, Пастухоў, Пэтэрс, Пятроў, Перакатаў, Плешакоў, Падвойскі, Позэрн, Покко, Полін, Радус-Зяньковіч, Растопчын, Рэдэнс, Рынвальд, Рыўкін, Розэнгольц, Розіт, Разьніровіч, Розэйман, Раманаў, Савосьцін, Сахарава, Сафіянава, Сямкоў, Сярганін, Сяргушоў, Сіротаў, Сьмідовіч, Смародзін, Сольц, Стараньнікаў, Старосьцін, Сьцепаванны, Стральцоў, Стугідаў, Струва, Вано, Стэн, Тайбэрг, Церахаў, Трыліссэр, Трупэчкін, Тышчэнка, Ульянава, Фабрыцыус, Фацеєў, Фігатнер, Фектэр, Фільлер, Хасман, Цьвяткоў, Цылько, Шацкін, Швайцэр, Шабалдаеў, Шкевіч, Шкіратаў, Шлок, Шотман, Шпраух, Шушкоў, Юносаў, Юркін, Юрцен, Якаўлеў А., Якаўлеў Я. А., Янсон і 195-ы—Яраслаўскі.

Водгукі польска-літоўскага замірэньня.

ПОЛЬСКА-ЛІТОЎСКІЯ ПЕРАГАВОРЫ.

«Роботнік» паведамляе, што польска-літоўскія перагаворы распачнуцца ў спрэдзіне студзеня і будуць папярэджаны перагаворамі ў справе пунктаў, якія зьявяцца тэмай супольных нарад.

Перастараліся...

Некаторыя польскія газэты, асабліва зблізканыя да ўраду сталі зьмяшчаць у часе разгляду ў Жэневе польска-літоўскага канфлікту вельмі хвасьлівыя тэлеграмы, быццам прыезд Пілсудзкага выклікаў у Лізе Нацый «белы страх» і яна „працавала пад націскам" і г. д.

У рэзультаце—ў замежнай прэсе зьявіліся іранічныя камэнтары, а в боку Штрэзэмана афіцыяльны пратэст.

Вышла як у байцы Крылова—«услужлівы дурань небясьпечней ворага».

«НЕДАЛІКАТНАЕ» ЖАДАНЬНЕ.

Поўафіцыяльны «Летувіс» зьмясьціў артыкул, які жадае, каб Польшча зрабіла немагчымым для Плечкайціса яго працу над арганізацыяй эмігрантаў і пасадзіла яго ў вастрог, або выдаліла з межаў Польшчы.

«Глос Правды» называе гэтае жаданьне «Летувіса» «педалікатным».

Канфіскацыя літоўскай газэты.

Урадавы камісар г. Вільні канфіскаваў наклад літоўскай газэты за зьмяшчэньне артыкулу: „Жэнэўская баталія", у якім угледжаны прастуўкі проці 154 арт. К. К.

Перад выбарамі ў Польшчы.

ЛЕВЫ БЛЁК МЕНШАСЬЦЯЎ.

«Дз. Віл.» паведамляе, што гэтымі днямі ў Вільні ўтварыўся левы блёк нацменшасьцяў, у склад якога ўвайшлі: лявіца ППС, дробнэраўцы, яўрэйскі «бунд» і лявіца б. «Грамады».

НА ШЛЯХОХ ДА МАНАРХІІ.

«Саюз направы Рэчы Паспалітай»—партыі, якая падтрымлівае ўрад Пілсудзкага, надрукаваў у сваёй газэце «Пшэлом» тэ

Перавыбары ў каапэрацыі.

Праца была нікудышняй.

На 70 проц. сабраліся ўпаўнаважаныя 4 сьнежня ў нардоме м. Самахвалавічы, каб паслухаць справаздачу поўгадовай дзейнасьці т-ства і абраць новае праўленьне.

У справаздачы старшыня праўленьня аб працы зазначыў, што зварот суродоць мінулага году ў т-стве памепшыўся на 2000 рубл. у м-ц. Зьніжэньне праведзена ў жыцьцё поўнасьцю, але толькі к 1 кастрычніка. Млын, які арандуе т-ства, даў 665 руб. страты, каапераваньне беднаты не праведзена і 784 руб. фонду не скарыстана. З год выбыла 67 пайшчыкаў, а па іншых прычынах, то і старшыня ня ведае, і г. д. Пасьля дакладу было заведзена каля 30 пытаньняў і 20 выступіла ў спрэчках; былі досыць цікавыя пытаньні, як, напрыклад:

«Ці маюцца ў т-стве пайшчыкі спэкулянты, і якія ня маюць права голасу»?

«Маюцца, адказаў старшыня.

І сапраўды ёсьць некалькі спэкулянтаў, якія плацяць больш 1000 р. падатку і лічацца пайшчыкамі, а ёсьць выпадкі, што ў сям'і спэкулянта 2-3 пайшчыкі, прыходзіць кожны і бярэ з кніжку тавар у той час, як бядняк не каапэраван і тавару не адпускаюць.

«А як-жа праводзілася зьніжэньне цэн»?

Зьніжэньне цэн адбылося за рахунак прыбытку, а скарачэньне, рацыяналізацыя апарату і зьмяншэньне накладных выдаткаў не закраналася.

Розных даўгоў і растрат за мінулыя гады налічваецца 1891 руб. 80 к., спагнаць якія праўленьне не клапацілася. Культпрыцы не праводзілася. Пайшчыкам неабходных тавараў не дастаўлялі, а калі што лепшае прывязуць, то ўсё заставалася ў спэкулянтаў, якія потым перапрадавалі і бралі ў трыдорага.

Вось што казалі пайшчыкі на перавыбарным сходзе.

Усе гэтыя недахваты былі добра заўважаны і даваліся наказы аб лепшай настаноўцы працы, якая ў сапраўднасьці апраўдала-б тыя задачы, якія ставіць перад ёй савецкая ўлада і партыя.

Самі перавыбары прайшлі з вялікай актыўнасьцю. Кожная кандыдатура абгаварвалася і ў выніку ўсяго ніводзін член праўленьня мінулага складу не ўвайшоў у члены, а праўленьне абрана новае і ёсьць надзея, што справа т-ва павінна пасунуцца ўперад, выконваючы тыя наказы, якія даваліся пайшчыкамі на сходзе. **Пайшчык К.**

М-ка Самахвалавічы, Меншчына.

Каапэрацыя абнаўляецца.

Перавыбары праўленьняў і рэвізійных камісіяў спажывецкай каапэрацыі Меншчыны распачаліся 15-га лістапада. Уся перавыбарчая кампанія на 90 спажывецкіх таварыствах павінна быць закончана 15-га студзеня.

Выбары прайшлі ўжо ў 13 таварыствах, якія далі досыць здавальняючыя вынікі і куды лепшыя, чымсь у мінулую кампанію.

За гэты час праведзена 120 справаздачных сходаў, на якіх прысутнічала 6332 чалавекі, з іх пайшчыкаў 4693. З агульнага ліку прысутных на сходах было 410 жанчын і 501 моладзі.

Перад перавыбарамі спажывецкіх таварыстваў праведзена было яшчэ 8 адрыхтоўчых сходаў моладзі, на якіх прысутнічала 213 асоб і 35 сходаў беднаты, на якіх прысутнічала 981 беднякоў і сераднякоў. На перавыбарных сходах упаўнаважаных павінна было быць 1107 асоб, а было 807, неўпаўнаважаных удзельнічала 778 асоб, пайшчыкаў павінна было прысутнічаць 1830, а было 800 і пайшчыкаў было 167. Гэта сьведчыць за тое, што маса пайшчыкаў больш яшчэ як на 50 проц. не зразумела важнасьць пытаньня выбараў сваёй каапэрацыі.

З агульнага ліку прысутных на перавыбарчых сходах 2547 асоб, у спрэчках брала ўдзел 271 асоба ці 10,6 проц. ад агульнага ліку прысутных, што ў параўнаньні з мінулай кампаніяй дало значнае павышэньне. Характэрна тое, што ў спрэчках пайшчыкі даюць наказ павялічыць лік тавараў, зьменшыць накладныя выдаткі, зьнізіць цэны і г. д.

Абрана ў новыя праўленьні: 16 партыйцаў, 5 камсамольцаў, 36 беспартыйных, 22 беднякоў, 17 сераднякоў, 4 рабочых і 14 служачых, у гэтым ліку новых працаўнікоў абрана 28 асоб і старых—29. У рэвізійныя камісіі абрана: новых—39 асоб і старых—15. **М.**

Вырасьлі на 35 процантаў.

У 1926 г. Рагачоўскі ЦРК стаў абкуроўваць акаляючых сялян у радыусе 9-10 кілёмэтраў, альбо 1963 гасадаркі. З гэтага часу ЦРК апошні аз рэфармуецца ў гарадзкое спажывецкае т-ва. Колькасьць пайшчыкаў вагае 1911 чал., паявыя капіталы даўняюцца 5433 руб., зварот складае 02.139 руб., пры 11,9 проц., накладаньня. З гэтага часу яно ўжо зьяўляецца рэгулятарам рынкавых цэн.

За апошні справаздачны год паявыя ўносы складаюць капітал у 10056 р.; лік пайнікаў—3000 ч; зварот—825 тысяч руб., процант накладаньня—0,6.

Адчыненыя ў дзьвёх вёсках каапэрацыйныя крамы зьявіліся лепшымі агітатарамі каапэрацыйнага гандлю.

Для масавага грамадзкага кантролю і разьвіцьця актыўнасьці, зацікаўленасьці пайнікаў арганізована 8 крамных камісіяў, якія налічваюць 50 сяброў. Праца іх з кожным часам больш напраўляецца і зьяўляецца службай сувязі паміж масамі пайнікаў і праўленьнем.

Калі «каапэрацыя—шлях да сацыялізму», дык на нашым Рагачоўскім каапэрацыйным вучастку будуюцца ня кепскія калёны для нераможнага наступленьня каапэрацыйнага і дзяржаўнага капіталу супроць прыватнага.

М. Віч.

Рагачоў, Бабруйскае акругі.

Трэба ісьці да прыватніка.

Кепска адчувае сябе некаторая частка служачых у с. Кругым. Праўленьне спажыв. каапэрацыі ня дае ў крэдыт тавараў. Старшыня праўленьня не дагаманіўся пакуль наконт гэтага з РВК, які адмаўляецца ўтрымліваць з пэнсіі на пагашэньне доўга.

— Дык як-жа быць, ці да прыватніка ісьці?—пытаюцца служачыя.

— Ня наша справа, што начальства скажа,—адказваюць каапэратары.

Прышлося зьвярнуцца да прыватніка, бо тавар патрэбен, а грошай няма. Я—стары каапэрацыйны працаўнік; да прыватніка ісьці не хацелася і пасьля доўгіх гутарак дабіўся маленькага крэдыту. Але ведаю, што крэдыт ёсьць, іншым і не малы, бо служачы кожны дзень за гроны ня возьме. Праўда, частка віны ляжыць і на нас. Некаторыя служачыя пры пераводах увозяць і доўг, які трэба потым зварочваць праз суд. Але трэба і нам жыць.

Зацікаўлены.

М. Круглае, Аршаншчына.

НА ВАРЦЕ КРАІНЫ САВЕТАЎ.

ПЕРШЫ ВОПЫТ.

(№ Чырвонаштандарны полк).

Пасьля выезду на райён дзеля правядзеньня дапрызыўнай кампалітсклад шырока разгарнуў працу сярод пераменнага складу. Калі ў мінулым годзе праца заключалася толькі ў тым, што хадзілі па вёсках ды рабілі даклады аб міжнародным становішчы, дык цяпер кожны вучэбны пункт стварае што-небудзь стацыянарнае, арганізацыйна афарыленае. Цяпер больш зварачваецца ўвагі на арганізацыю вайсковых куткоў і гурткоў вайсковых ведаў пры іх.

Калі ў мінулым годзе ня было канкрэтнага пляну працы сярод пераменнага складу, дык цяпер ён ёсьць, які абязвае кампалітсклад вучпунктаў, у адведныя нават дні, праводзіць указаную ў ім працу.

Згодна пляну, акрамя заданьняў кампалітскладу, праводзяцца аднадзённыя зборы пераменьнікаў пры вучпунктах. А каб гэтыя зборы не перашкаджалі абучэньню дапрызыўнікаў, яны праводзяцца ў сьвяточныя дні. Першы аднадзённы збор пераменьнікаў нашага палка адбыўся 11 сьнежня г.г. На гэтым зборы кампалітсклад вучпунктаў правёў наступную працу: 1) праведзена палітгадзіна на тэму: міжнароднае становішча і 10 гадоў эканамічнага і культурнага будаўніцтва СССР; 2) трапіровачная стральба; 3) узвод у разьведцы; 4) нарады кіраўнікоў ячэек авіяхіму, гурткоў вайсковых ведаў і вайскораў. Акрамя гэтага, пераменны склад разьбілі на групы, (што зьяўляецца першым вопытам) і далі кожнай групе заданьні па вайсковай справе. А каб гэтыя заданьні не засталіся толькі на паперы, пераменьнікам раздадзены кнігі «Беседы о воинской и Красной армии», па якіх яны і павінны выконваць заданьні. Наступны збор 25-26 сьнежня павінне будзе праверыць, як гэтыя заданьні выканаены на справе.

Вайскор.

БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ ПАЛКАВОЙ ШКОЛЫ.

(№ стр. полк).

У палкавой школе № стр. палка страявая вучоба і частка зброі вывучаецца на беларускай мове. Гэта ёсьць дасягненьне, але разам з гэтым ёсьць шмат перашкод, якія дрэнна адбіваюцца на правядзеньні беларусізацыі.

Папершае, камскладу, асабліва малодшаму, які праходзіў усю вучобу ў школе на расейскай мове, бывае цяжка запамятаць беларускія словы вайсковай тэрміналёгіі.

Падругое, частка сярэдняга камскладу—вялікарусы, якім надта цяжка дасцца беларуская мова.

Недахоп статутаў і падручнікаў на беларускай мове таксама значна перашкаджае тэмпу беларусізацыі школы.

Ёсьць асобныя таварышы, якія слаба разумеюць нацыналітыку і значэньне беларусізацыі.

Але з боку ўсяго камандзнага складу партыйная ячэйка і камсамольская групы школы на справу беларусізацыі зварочваецца сур'ёзная ўвага.

Можна спадзявацца, што к налецьцю будуць выпушчаны камандзіры, здольныя навучаць чырвонаармейцаў вайсковай справе на сваей роднай мове.

Найдовіч.

Дапрызыўнікі маюць свой аркестр.

Дапрызыўная падрыхтоўка ў Любанскім райёне праходзіць пасьпяхова. Яўка дапрызыўнікаў была свячасовай. Мядыцынскі абгляд прайшоў добра. Большасьць дапрызыўнікаў заяўлялі, што ім нечага разьдзявацца, бо яны саўсім здаровыя.

Усе дапрызыўнікі былі астрыжаны, усім прышчэплена воспа. Разьмешчаны на прыватных кватэрах.

З першага сьнежня прыступілі да рэгулярных заняткаў. За гэты кароткі пэрыяд мы ўжо маем дасягненьні: вайсковыя заняткі ўсвайваюцца добра, дапрызыўнікі навучыліся хадзіць у нагу, перастрайвацца, добра ведаюць баявыя парадкі аддзяленьня, добра ўсвайваюць вінтоўку.

З прычыны слабага разьвіцьця дапрызыўнікаў, налітзаняткі ўсвайваюцца слаба.

Усе дапрызыўнікі харчуюцца з агульнага катла, за выключэньнем асоб, за якімі захоўваецца зарплата.

Для палепшаньня свайго катла дапрызыўнікі дабрахвотна ўнесьлі па 60 кап.

Кожны дзень дапрызыўнікі маюць сьнеданьне, гарбату і полудзень.

Шмат зроблена і ў пазашкольнай працы: абсталяван ленкуток, арганізаваны розныя групы, гурток дапамогі тым дапрызыўнікам, якія адстаюць па вайсковых заняткох.

Асабліва характэрны гурток гэта—музычны: у ім маецца 4 скрыпкі, 1 барабан і гармонік. Гэты гурток карыстаецца вялікім посьпехам сярод дапрызыўнікаў. Хутка будзем хадзіць пад свой аркестр строем.

Л—ў.

РАБОТНІЦЫ НЕ АДСТАЮЦЬ.

(Новабеліца, Гомельшчына).

У г. Новабеліцы маецца некалькі заводаў і фабрык з вялікім лікам рабочых. Тут-жа, поміж раскватараваны кадравыя вайсковыя часьці. Умовы для справы ваенізацыі—спрыяючыя.

У апошнія часы праца па ваенізацыі разгарнулася ня толькі сярод рабочых, але і сярод работніц. Райённае таварыства Чырвонага Крыжу, разам з Гомельскім акруговым паставіла сабе мэтай падрыхтаваць з маладых работніц будучых чырвоных сясьцёр. І І трэба сказаць, што пры актыўным садзейнічаньні і практычнай дапамозе вайсковых часьцей, гэта справа шпарка пасоўваецца наперад. Нядаўна прайшоў цэлы шэраг выпускаў па ўсіх фабрыках і заводах курсантак «Чырвоных сясьцёр». Напрыклад, выпуск 15 курсантак «Чырвоных сясьцёр», пасьпяхова скончыўшых сваю працу на сьпірта-водачным заводзе і г. д.

Такім чынам, паступова мы будзем падрыхтоўваць з ліку работніц сваіх чырвоных сясьцёр. **М.**

„Сур'ёзная ўвага да вучобы—заклад нашай перамогі".

(Горацкі р., Аршанск. акр.).

З васьмі гадзін раніцы 5 сьнежня пачалі прыбываць дапрызыўнікі на Горацкі вучпункт.

Вясёлыя, бадзёрыя хлопцы з радасьцю вітаюць сваіх камандзіраў.

Назаўтра раніцой пачынаюцца заняткі.

Яшчэ рана, а ўжо песьня дапрызыўніка чутна ва ўсіх куткох мястэчка. Прагулка. Пасьля гэтага—за працу. Перш праводзіцца палітгадзіна, потым разьбірасьцца статут унутранай гарнізоннай службы, стралковая справа. Больш усяго дапрызыўнікі цікавяцца стральбой, але стральбу праводзіць яшчэ рана. Перш трэба добра навучыцца ўладаць зброяй, а потым практычна праверыць вучобу. Камандзіры добра растлумачваюць дапрызыўнікам аб правілах стралковай справы.

Дапрызыўнікі ўважліва і пасьпяхова вывучаюць вайсковую справу.

Вучоба праводзіцца пад лёзунгам: «Сур'ёзная ўвага да вайсковай справы—заклад перамогі ў час вайны».

Падрыхтоўка да 10-й гадавіны Чырвонай арміі.

Адчыняецца 16 дамоў Чырвонай арміі.

У дзень гадавіны 23 лютага адчыняецца 16 новых дамоў Чырвонай арміі. Падрыхтоўваецца да друку сэрыя кніг і брашур па гісторыі Чырвонай арміі і грамадзянскай вайны. Сумесна з ЦК ВЛКСМ распрацоўваецца плян баявога абгаду камсамола.

Юбілейны фільм.

Для пастановак у чырвонаармейскіх клюбах зладзены ў друк пьесы „Мятаж" і „Красноармейская оперетта".

Дзяржвакінко рыхтуе юбілейны фільм (тэму „Великий путь").

Гісторыя Чырвонага флёту.

Камісія па правядзеньню 10 гадавіны РСЧА у Чарнаморскім флёце зьбірае матар'ял, які адбівае моманты будаўніцтва Чырвонага Чарнаморскага флёту з 1920 г. да сучаснага дню.

Гэты матар'ял будзе выкарыстан у брашуры „История создания, развития и строительства красного флота", якая будзе выдадзена да сьвяткаваньня гадавіны.

Як „разброіваецца" Амэрыка.

Марское міністэрства Злучаных Штатаў Амэрыкі некалькі гадоў таму назад пачало будаваць крайсэр у 43 тыс. тон. Крайсэр быў [illegible] 16-дюймовымі гарматамі. Але з [illegible] прычыны, што Вашынгтонская канфэрэнцыя не дазваляе будаваць такія вялікія крайсэры, ваеннае міністэрства перабудавала гэты крайсэр у авіёматку.

У канцы кастрычніка г. г. міністэрства спусьціла гэту авіё-матку на ваду. Па ёй пастаўлена 8 дальнабойных 8-дюймовых гармат, 12 гармат меншага калібру дзеля абстрэлу самалётаў і 4 гарматы спэцыяльных. Усяго 24 гарматы.

Захопленыя ідэяй „разброеньня", амэрыканцы пабудавалі яшчэ адну новую авіёматку пад назвай Саратога. Яна мае ў даўжыню 127 сажняў. Верхняя палуба ўяўляе сабой аэрадром у 125 сажняў даўжыні і 13 сажняў шырыні.

Ангары, якія знаходзяцца пад верхняй палубай, свабодна ўмяшчаюць 72 аэраплены розных сыстэмаў.

Аэраплены падымаюцца на палубу і спускаюцца ўніз у ангары на спэцыяльных ліфтах. Капельнае аддзяленьне мае выгляд аграмаднага тунэлю, у якім могуць свабодна зьмясьціцца 12 паездоў з вялікай нагрузкай.

Авіё-матка Саратога ўяўляе сабой аграмадную электрычную станцыю з шэрагам генэратараў. Паравыя турбіны прыводзяць у рух шэраг дынамо-машын, агульнай магутнасьцю ў 180 тысяч конскіх сіл. Гэта сіла перадаецца на чатыры вінты, з дапамогай якіх авіё-матка ідзе з хуткасьцю 40 міль у гадзіну.

Майстэрні, якія знаходзяцца ў ніжэйшай частцы судна, маюць такое абсталяваньне, што ня толькі папраўляюць сапсаваныя апараты, але могуць зрабіць новыя аэраплены любой канструкцыі і даць ім любыя маторы.

На авіё-матцы ёсьць 1.450 авіятараў, мацнёраў і судовай каманды.

У хуткім часе будзе спушчана яшчэ другая авіё-матка такой самай велічыні.

Амэрыканскае марское міністэрства рыхтуецца падаць на зацьверджаньне канграсу пяцігадовую праграму пабудовы ваенных суднаў. Праграма прадбачыць пабудову новых 26 крэйсараў, 3 авіяматкі, 5 падводных лодак і 18 зьвышчыцеляў, а таксама браненосцы дзеля замены ўстарэлых. Пр 4 зьдзет Кулідж гэту праграму ўхваліў. Э.

Партыйнае жыцьцё

125 новых ленінцаў.

(Акцябрскі райён, Менск).

15 сьнежня адбыўся пленум Акцябрскага райкому КПБ, на якім было прынята ў КПБ 125 рабочых, галоўным чынам, чыгуначнікаў і шклянага заводу.

З ліку прынятых шмат рабочых з вялікім вытворчым стажам.

Паступленьне заяў ня спыняецца, апрача ўжо 125 прынятых у партыю, яшчэ паступіла каля 25 заяў.

Праца ячэек з беспарт. актывам.

(Ф-ка «Дзьвіна»).

Праца сярод беспартыйнага актыву да апошняга часу прахадзіла стыхійна, і толькі за апошні час, у сувязі з шэрагам дырэктыў парторганаў, па працы сярод беспартыйнага актыву, партыйныя ячэйкі зьвярнулі больш увагі гэтай працы і яна прыняла больш плянавы і арганізацыйны характар. Трэба адзначыць, што ў самай партыйнай арганізацыі, асабліва ў ячэйках, ня ведалі, каго лічыць актывам. У некаторых ячэйках, беспартыйным актывам лічылі ўсіх тых, хто быў абран і прымаў удзел у працы грамадзкіх арганізацый. Але трэба сказаць, што гэты погляд нашых партыйных ячэек быў неправядловы. Мы мелі выпадкі, калі таварышы, абраныя ў тую ці іншую грамадзкую арганізацыю, выявілі сябе не заўсёды як актывісты.

Усё гэта паставіла перад райённым камітэтам партыі неабходнасьць абгаварэньня пытаньня—каго лічыць беспартыйным актывам. Ці беспартыйным актывам лічыць толькі абраных таварышоў у розныя арганізацыі, ці ўсіх тых, хто прымае актыўны ўдзел у працы нашых грамадзкіх арганізацый.

Пры абгаварэньні гэтага пытаньня, райком партыі прышоў к выводу, што беспартыйным актывам трэба лічыць кожнага таварыша, хто хоць настаянна не працуе ў тэй ці іншай арганізацыі, але выяўляе так ці інакш сваю актыўнасьць—актыўным удзелам у працы вытворчых нарад, рабочых і адчыненых ячэйковых сходах і г. д.

Вучот, якасьць, колькасьць беспарт. актыву.

Выяўленьне і вучот беспартыйнага актыву, за некаторым выключэньнем рабілася паміма партыйных ячэек, і таму ячэйкі часам ня ведалі каго лічыць беспартыйным актывам. І беспартыйны актыў ня быў узяты на вучот, як партячэйкамі, так і прафорганамі, а калі і быў на вучоце, то толькі часткова.

Праца сярод беспартыйнага актыву з агульнай працы фабкому і партячэек не вылучалася, так як яна з ім не праводзілася.

Праца беспартыйнага актыву.

Праца беспартыйнага актыву, залежала ад працы, тэй арганізацыі, у якую яны былі ўцягнуты—абраны. Лепш усяго актыў вывіў сябе ў працы камісіі фабкому—як больш працаздольнай арганізацыі. Гэта тлумачыцца яшчэ і тым, што зьмест самай працы фабкому блізак і знаём нашым рабочым, і, напрыклад, актыў, які быў у дабраахвотных арганізацыях—МОПР, Культзмычка і г. д. не праявіў сябе, затым, што гэтыя арганізацыі—пачынаюць толькі ўзмацняць сваю працу.

Задачы партячэек.

Нашыя партячэйкі да апошняга часу не зьвярталі належнай увагі на працу сярод беспарт. актыву. У далейшым гэту недаробнасьць трэба выправіць.—Пры складаньні плянаў працы неабходна заўважыць і галіну працы з беспартыйным актывам. Практыкаваць правядзеньне нарад актыву па розных пытаньнях, практыкаваць справаздачы актывістаў аб сваёй працы. Арганізаваць розныя гурткі—рабкораўскі, парзасядацеляй, прафгурткі. А калі ў нас зараз праводзіцца камплектаваньне партсеці—нашыя партыйныя ячэйкі павінны ўцягнуць беспартыйны актыў у паліт-школы, пад лёзунгам актывіст падымай свой палітычна-культурны ўзровень.

Ул. Каткевіч.

Поўны адпор.

(Гарадоцкая райпартарганізацыя, Віцебшчына).

Адным з галоўных пытаньняў апошняга райпартсходу стояла пытаньне аб выніках 11-га зьезду КПБ і прыём у партыю.

Дакладчык тав. Бутар, удзельнік 11 зьезду, цікава і поўна асьвятліў усе тыя задачы, якія стаяць перад партыяй на падставе пастаноў зьезду. Да дакладу сябры партыі аднесьліся вельмі ўважліва. Кожны жадаў як мага лепш зразумець пастановы зьезду дзеля правядзеньня іх у жыцьцё.

Пытаньне аб апазіцыі. У зале—ціш. Мэта—непрапусьціць ніводнага слова. Відаць, што кожнаму дорага адзінства Ленінскае партыі.

Што сказаў сход?

Цалкам далучыцца да пастаноў 11-га зьезду. Упэўнены, што пастаўленыя зьездам задачы, пры падтрыманьні рабочае клясы, будуць цалкам выкананы. Перараджэньня партыі няма, партыя—адзіна і моцна.

На гэтым-жа сходзе ў шэрагі партыі прынята новых 8 лепшых з вытворчасьці рабочых.

На пытаньне ім:—чаму йдзе у партыю? адказ просты.

— Зразумеў і сазнаў. Жадаю даказаць апазіцыі, што рабочая клясэ ідзе ня з імі. Яны—іх ворагі.

Ёсьць яшчэ шмат жадаючых уступіць у партыю.

Парткор.

Партыйцаў і камсамольцаў-вучняў трэба разгрузіць.

Ва ўсіх гарадох Беларусі, у тым ліку і г Менску, існуе цэлы шэраг вячэрніх вучэбных устаноў, як: вячэрнія рабфакі, савпартшколы, школы розных тыпаў і г. д. Тут вучыцца значная частка партыйцаў і камсамольцаў, дзеля якіх да гэтага часу ня зроблены (убольшасьці) спрыяючыя ўмовы для вучобы, таму, што некаторыя ячэйкі не разгрузілі тых партыйцаў і камсамольцаў, якія займаюцца ў вячэрніх школах, а таксама і ў вячэрніх рабфаках.

Бязумоўна, што партыец, альбо камсамолец ня можа быць без нагрузкі, але гэта не гаворыць аб тым, што гэтых партыйцаў, і камсамольцаў трэба вельмі перагружаць працай у ячэйках і ва ўсякім разе яны па вінны мець адзін ці два абавязкаў.

Усіх партыйцаў і камсамольцаў, у вячэрніх рабфакі, школы і інш.—пасылала партыя і камсамол, а раз яны пасланы,—то ім патрэбны для вучобы належныя ўмовы.

У нас, на Менскім вячэрнім рабфаку, таксама ёсьць шмат камуністаў і амаль усе скардзяцца, што яны перагружаны партыйнымі абавязкамі і на раз былі выпадкі калі камуністу прыходзіцца пакідаць лекцыі.

— Куды вы, таварыш, яшчэ ня скончаны заняткі.

— Няма часу, трэба ісьці на пасяджэньне камісіі.

Вось арґінальны з натуры выпадак у Менскім вяч. рабфаку. Гэта пытаньне вельмі сур'ёзнае, і такая пастаноўка працы не дае карысьці, а толькі «калечыць» людзей.

Асабліва трэба высунуць пытаньне гэта ў адносінах вячэрніх рабфакаў, таму, што ў іх вялікая праграма і патрэбуе вялікай напружанасьці з боку студэнтаў, Парт. і камсамольскім ячэйкам необходна пераглядзець абавязкі гэтых таварышоў, з пункту погляду разгрузкі іх і дачы магчымасьці займацца бяз усякіх перашкод. Потым неабходна, каб таварышы з іншых вячэрніх рабфакаў і школ высьветлілі, як у іх абстаіць справа ў гэтых адносінах.

Я. Таганскі.

Працу рэвізійных камісій жактаў гор. Менску неабходна ажывіць.

Ня гледзячы на значныя грашовыя зваротаў жактах гор. Менску, у шэрагу выпадкаў у гэтых арганізацыях рэвізійныя камісіі працуюць нездавальняюча.

Прыкладам такога зьявішча можа быць справа з рэвізійнай камісіяй жакту № 22. Гэта камісія ад дню свайго абраньня вялікіх адзнакаў жыцьця ня выявіла. Агульны сход пайшчыкаў памянёнага жакту, заслухаўшы справаздачны даклад старшыні праўленьня, адмовіўся даць апоўку працы праўленьня. Пры гэтым сход паставіў: прапанаваць сябрам рэвізійнай камісіі ў тэрміновым парадку абрэвізаваць дзейнасьць праўленьня, пасьля чаго зрабіць на агульным сходзе справаздачу.

Мы ня ведаем прычын, па якіх рэвізійная камісія жакту № 22 аказалася сапраўдным мерцьвяком. Аб гэтым павінны нам сказаць праўленьне жакту і Белжылсаюз.

Мэта наша іншая. Мы пастараемся ў некалькіх рысах застанавіцца на тым, як зрабіць, каб у далейшы час рэвізійныя камісіі жактаў былі сапраўдным дзейнічаючым апаратам, былі сапраўднымі вачыма пайшчыкаў у справах праўленьня.

Наш вопыт па працы рэвізійных камісій розных грамадзкіх і прафесійных арганізацый дае нам магчымасьць сказаць, што бязьдзейнасьць рэвізійных камісій, наогул, у большасьці залежыць ад дзьвюх прычын: а) ад наўдачнага персанальнага падбору сяброў камісіі і б) ад характару ўзаемаадносін праўленьня з рэвізійнымі камісіямі.

Адхіліць першую прычыну лёгка толькі на выбарах, калі ўтвараецца склад самой камісіі; тут патрэбна вялікая ўвага у рэвізійную камісію не па „почету", а на здольнасьці асобы да рэвізійнай працы.

Што-ж датычыцца другой прычыны, дык тут трэба адзначыць, што пры добрых таварыскіх адносінах праўленьня і рэвізійнай камісіі праца гэтай камісіі будзе ісьці пасьпяхова.

І, наадварот, калі паміж праўленьнем і рэвізійнай камісіяй існуюць фармальныя, бюракратычныя адносіны, тады ня можа быць і гутаркі аб пасьпяховасьці працы.

Мы думаем, што у тым выпадку, калі на тых ці іншых прычынах рэвізійная камісія не працуе, праўленьне павінна прыняць крокі да таго, каб прыцягнуць да сапраўднай працы сваю рэвізійную камісію. Дзеля гэтага ў руках праўленьня ёсьць розныя супраўдныя магчымасьці, да ліку якіх можна аднесьці наступнае:

Першае, праўленьне кожны раз заарашае на сваё пасяджэньне прадстаўніка ад рэвізійнай камісіі, чым і ўводзіць усю камісію ў курс штодзённай працы праўленьня.

Другое, пры вырашэньні пытаньняў, зьвязаных са значнай тратай грошай, праўленьне ня толькі даводзіць аб гэтым да ведама рэвізійнай камісіі, а на магчымасьці радзіцца з сябрамі рэвізійнай камісіі наконт выбараў таго ці іншага рашэньня.

Трэцце, усе фінансавыя планы, кашторысы, а таксама справаздачы па іх да прадстаўленьня іх у вышэйшыя каапэрацыйныя аб'яднаньні, ці для дакладу на агульных сходах візіруюцца рэвізійнай камісіяй.

Чацьвёртае, пастанова праўленьня аб скліканьні справаздачнага сходу пайшчыкаў павінна быць узгоднена з рэвізійнай камісіяй, каб апошняя мела патрэбны тэрмін для правядзеньня рэвізіі і падрыхтоўкі да садакладупа справаздачы праўленьня.

Пятае, калі выпушчаецца абвестка аб маючай быць справаздачы праўленьня, у ёй абавязкова вызначаецца і садаклад рэвізійнай камісіі.

Шостае, калі па тых ці іншых прычынах рэвізійная камісія доўгі тэрмін не выяўляе сваёй працаздольнасьці, праўленьне абавязана ўзяць на сябе ініцыятыву па ўцягненьні рэвізійнай камісіі ў працу.

Сёмае, жыцьцёвыя патрэбы выклікаюць неабходнасьць рэвізіі ў некаторых актах ня толькі іх грашовых спраў, але і спраў па разьмеркаваньні жыльлёвай плошчы.

Можна было-б застанавіцца і на іншых прыкладах, але мы лічым, што вызначанага будзе даволі для таго, каб паказаць, якім спосабам праўленьне, пры жаданьні з яго боку, можа ажывіць і паладзіць працу сваёй рэвізійнай камісіі. **Е. Р.**

Памяці першага старшыні ВЧК-ДПУ т. Ф. Э. Дзяржынскага.

(Да 10-годзьдзя ВЧК-ДПУ.)

„Гаварыць аб Дзяржынскім-чэкісьце—значыць пісаць гісторыю ВЧК-ДПУ".
В. МЕНЖЫНСКІ.

ГРАЗА БУРЖУАЗЕІ.

У дзень пахаваньня тав. Дзяржынскага т. Сталін напісаў аб ім наступнае:

... «Калі цяпер, каля адчыненай труны, усьпамінаеш увесь жыцьцёвы шлях Дзяржынскага—астрогу, катаргі, высылкі, Надзвычайную Камісію па барацьбе з контр-рэвалюцыяй, аднаўленьне зруйнаванага транспарту, будаўніцтва маладой сацыялістычнай прамысловасьці—хочацца адным словам ахарактарызаваць гэтае кіпучае жыцьцё: гарэньне, гарэньне і гэройская адвага ў барацьбе з цяжкасьцямі».

Кастрычнікавая рэвалюцыя паставіла яго на адказную пасаду, на пасаду кіраўніка Надзвычайнае Камісіі па барацьбе з контр-рэвалюцыяй. Буржуазея ня ведала больш ненавіснага імя, чымся імя Дзяржынскага, які адбіваў сталёвую рукою ўдары ворагаў пралетарскае рэвалюцыі. Граза буржуазеі—вось чым быў Фэлікс Дзяржынскі.

ДЗЯРЖЫНСКІ—ЗАКОНАПАСЛУХМЯНЫ ЧЛЕН ПАРТЫІ.

... Індывідэрэнтна адносючыся да скогату буржуазеі аб камуністычных катах, надзвычайна сурова адбіваючы напады нездавальняюча рэвалюцыйных таварышоў на ЧК, Дзяржынскі вельмі баяўся, каб яна не зрабілася незалежным, ізаляваным органам, каб ня здарылася адрыву ад партыі, урэшце, каб яе працаўнікі не пачалі разлагацца, карыстаючыся вялізнымі правамі ў абставінах грамадзянскае вайны. Ён стала ламаў, перабудоўваў і зноў і зноў правяраў людзей, структуру, прыёмы, больш усяго баючыся, каб ў ЧК-ДПУ—не завязалася валакіта, бяздушша і руціна...

...—Той, хто стаў чэрствым,—той не гадзіцца больш для працы ў ЧК, казаў ён. Чэрствы чэкіст быў па яго думцы нягодным не з-за суровасьці, а як свайго роду заржавелы інструмант, як чалавек, стаўшы нездольным да псыхолёгічнай працы...

... Справа была новая, цяжкая, якая вымагала ня толькі жалезнае волі і моцных нэрваў, але і яснай галавы, крыстальёвай сумленнасьці, гнуткасьці, пачуванай і абсалютнай бесьпярэчнай адданасьці і законапаслухмянасьці партыі. «ЧК павінна быць органам Цэнтральнага Камітэту, бо інакш яна будзе шкодная, калі яна ператорыцца ў ахранку», заўсёды гаварыў т. Дзяржынскі...

Так пісаў аб сваім папярэдніку сучасны старшыня ДПУ т. Р. Менжынскі, які больш усяго меў з ім супольнага па працы ў ЧК.

ЗА ШТО БУРЖУАЗЕЯ НЕНАВІДЗЕЛА ДЗЯРЖЫНСКАГА.

«Яны (наша бацькаўская белагвардзейчына і заграніччная буржуазея)—гаворыць адзін з саратнікаў т. Дзяржынскага па надпольнай працы т. Я. Ганэцкі,—ненавідзяць яго за тое, што ў ім было найбольш каштоўнае для Кастрычнікавай рэвалюцыі. Ён жа быў аснавальнікам, душою ЧК. І ў гэтай яго дзейнасьці быць можа самая вялікая паслуга перад рэвалюцыяй. Толькі жалезная энэргія, гранітная воля, асабістая адвага Дзяржынскага маглі так хутка стварыць гэты магутны рэвалюцыйны орган, стаючы на варце завадзёў Кастрычніку».

ДЗЯРЖЫНСКІ—АДДАНЫ ТАВАРЫШ

«Я ўспамінаю, піша т. С. Лобаў,—адзін мой прыезд з Петраграду з дакладам Ф. Э. Ён абедаў... у службовым габінэце і запрапанаваў пазабедаць і мне, але аказалася, што абедаў больш няма. Тады т. Дзяржынскі прымусіў мяне зьесьці палову яго абеду.

Зараз гэта можа паказацца вельмі нязначным, але ў тыя маладыя гады (1918-20) гэта было зьявішчам надзвычайным.

«Выключна папяроджаныя адносіны да таварышоў і да справы т. Дзяржынскага згуртавалі навакол органаў ЧК лепшую частку рабочае клясы і забясьпечыла нам выключныя посьпехі ў барацьбе з контр-рэвалюцыяй».

Аб тым жа гаворыць адзін з найбольш выдатных супрацоўнікаў т. Дзяржынскага т. В. Мацкаў. Ён піша:

«... Да асабістых рысаў Дзяржынскага, як кіраўніка ЧК, трэба аднесьці тую вялізную сароўнасьць яго характару, дзякуючы якой асноўны кадр працаўнікоў ЧК зусім бязьмежна быў яму адданы і бесьпярэчна выконваў яго загады, ведаючы, што яго загады зьяўляюцца ў той жа час рэвалюцыйнай неабходнасьцю і загадамі партыі».

Да таго, пры ўсіх сваіх якасьцях рэвалюцыйнага правадыра Дзяржынскі быў заўсёды па таварыскі просты і па таварыскі верны.

Гэтым тлумачыцца тое, што сям'я чэкістаў на чале з ім склала шчыльную і дружную сям'ю, аб'яднаную гарачай верай у правасьць рэвалюцыйнай ідэі і ў канчатковую перамогу рабочае клясы.

У ЧЫМ МОЦ ЧК?

У часе барацьбы з Юдэнічам была выкрыта змова начальніку штабу петраградзкай абароны, які меў зносіны з Юдэнічам і дзейнічаў па яго загаду. Зброяй сувязі паганца быў стары, натуралізаваны француз. Дачка яго губляе на вуліцы паперы, звычайны чырвонаармеец знаходзіць гэтыя паперы, разглядае іх, бачыць нейкія рысункі. Ён ужо бачыў ваенныя рысункі, падазрае, што тут нешта ня добра і арыштоўвае дзяўчыну, якая згубіла паперы. Цяпер у руках ЧК галоўная ячэйка юдэніцкага шпіёнажу. Дзяржынскі аказдаў потым, што арыштаваны француз на допыце пахабна сказаў: «Калі-б ня гэты выпадак, вы

К. К. Герман.

Учора тэле раф прынёс паведамленьне аб тым, што ў Маскве памёр ранейшы ўпаўнаважаны Народнага Камісарыяту замежнага Гандлю БССР і старшыня Бел дзяржгандлю Карл Карлавіч Герман.

Тав. Герман быў стары бальшавік (былы палітканяжанін), і ён быў адным з асноўных працаўнікоў па замежным гандлі.

Тав. Герману было ўсяго 53-54 гады, але жыццё на катарзе, потым актыўны ўдзел у рэвалюцыі і нясупынная дзейнасьць на фронце замежнага гандлю на Беларусі падарвалі яго здароўе.

Як адміністратара, супрацоўнікі Бел-дзяржгандлю глыбока цанілі т. Германа. Гэта быў чулы і добры таварыш, які заўсёды пікавіўся становішчам супрацоўніка і падтрымліваў яго ў цяжкія хвіліны.

Тав. Герман быў шырока адукаваны, і яго выступленьні на сходах заўсёды былі захапляючыя і прыцягвалі поўныя аўдыторыі.

У пачатку мінулага году, пасьля рэарганізацыі Управы Дзяржаўнага Гандлю і Народных Камісарыятаў Замежнага Гандлю, калі быў арганізован агульны наркамат па ўнутраным і замежным гандлі, т. Герман быў назначан на адказную працу гандлёвым прадстаўніком СССР у Літве і да апошніх дзён свайго жыцьця пільна ахоўваў фронт замежнага гандлю.

Хроніка.

Страхаваньне батракоў.

На апошнім пасяджэньні Савету Сацыяльнага Страхаваньня разглядалася пытаньне аб страхаваньні батракоў, якія працуюць па найму ў сялянскіх гаспадарках. Пастанова ЦВК СССР прадугледжвала выдзяленьне паасобных райёнаў, дзе ёсьць вялікая колькасьць батрацтва, каб у гэтых месцах узмацніць ці арганізаваць апараты сацстраху.

Савет Сацыяльнага Страхаваньня Беларусі вырашыў асобных райёнаў не вызначаць, бо батрацтва па акругах БССР разьмяркована параўнальна аднолькава, а існуючая сетка райупаўнаважаных страхкас разьвіта куды больш, чым у суседніх савецкіх рэспубліках.

Савет прызнаў мэтазгодным і неабходным страхаваць усіх батракоў, але разам з тым пастаноўлена раней вывучыць фінансавыя магчымасьці.

Посьпехі беларускага мастацтва.

18-га сьнежня ў Маскве зачынілася выстаўка вобразнага і тэатральнага мастацтваў нацыянальнасьцяў СССР.

Перад зачыненьнем выстаўкі спэцыяльная камісія ў складзе прэзыдэнта Дзяржаўн й Акадэміі Мастацкіх Навук праф. Когана і выдатнейшых мастацтвазнаўцаў Масквы вызначыла прэміі за больш удалыя экспанаты. За лепшыя экспанаты беларускага аддзелу вызначаны ганаровыя дыпляёмы наступным арганізацыям: Усебеларускаму аб'яднаньню мастакоў, БДТ 1, БДТ 2, Беларускаму Нярэйскаму тэатру і Віцебскаму мастацкаму тэхнікуму. З паасобных узнагарод выстаўкі атрымалі дыпляёмы: па вобразным мастацтве—Філіповіч і Кастаянскі, па графіцы—Юдовін і Бразэр

Апроч таго, выставачны камітэт пры Дзяржаўнай Акадэміі Мастацкіх Навук пастанавіў зьмясьціць у адным з буйнейшых порыдычных выданьняў БССР свой водзыў аб беларускім мастацтве, а таксама здымкі экспазыцыі цэлай залі, паасобных работ, выступленьне хору і інш.

Жанчына—прафэсар БДУ.

Наркамасьветы зацьвердзіў прызначэньне Іванівкай прафэсарам БДУ па катэдры неарганічнай хіміі.

Парадак запрашэньня кавуковых працаўнікоў у ВНУ.

Калегія НКА, па дакладзе праўленьня Беларускай Дзяржаўнай Акадэміі Сельскай і Лясной Гаспадаркі, прапанаваў ацоннаму складу сьніс усіх навуковых працаўнікоў-беларусаў, якія працуюць за межамі БССР, і толькі пасьля зацьвярджэньня НКА запрашаць іх для працы на вакантныя пасады. Гэткі-ж парадак запрашэньня навуковых працаўнікоў і для БДУ.

Расейскія вучоныя—на дапамогу Беларусі.

ЦБ Краязнаўства наладзіла сувязь з цэлым шэрагам выдатных вучоных СССР у справе паглыбленьня і пашырэньня краязнаўчай справы.

Праф. Сямёнаў — Цян-Шаньскі, праф. Сялішчанскі і інш. згадзіліся зьмяшчаць у часопісу «Наш Край» артыкулы па пытаньнях краязнаўчай справы ў ВНУ і інш. мэтадолёгічны матар'ял.

Да зачыненьня мастацкай выстаўкі.

У пятніцу, 23-га сьнежня, Наркамасьветы супольна з ЦП саюзу працаўнікоў мастацтва наладжвае ў Доме Асьветы дыспут аб выніках 2-й усебеларускай мастацкай выстаўкі. У дыспуце прымуць удзел: ад Наркамасьветы—т. т. Баліцкі, Валасевіч і Вансоўскі, ад саюзу прадмастацтва—т. т. Табайнік і Маркоўскі, ад ІБК—т. т. Дыла і Шчакаціхін і інш.

Для азнаямленьня з экспанатамі выстаўкі 22 і 23 сьнежня наведваньне выстаўкі будзе дармовае.

Дзеці і кіно.

Наркамасьветы даручыў Навукова-Мэтадалёгічнаму камітэту распрацаваць рэкамэндацыйны сьпіс кіно-карцін для школ і дзіцячых раніцнікаў у кіно-тэатрах. Згодна распараджэньня НКА, дзеці да 15 гадоў уключна будуць дапушчацца толькі на тыя карціны, якія дазволены Наркамасьветы.

15 кілёмэтраў новай сеткі каналізацыі.

З вясны 1928 году распачнуцца ў Менску работы па пракладцы каналізацыйных труб. Мяркуецца пракласьць 15 кілёмэтраў новай сеткі каналізацыі.

Спазьненьне цягнікоў на МБЖ.

У сувязі з вялікімі сьнежнымі заносамі паміж Смаленскам і Воршай учора хуткі цягнік прыйшоў у Менск са спазьненьнем на 2 гадзіны.

Вучымся культурна гаспадарыць.

За мінулы год на абмарах БССР іскавалі 699 сельска-гаспадарчых гурткоў, у якія ўвахоздзілі 13.211 чалавек. Апроч таго, для прапаганды культурных форм сельскай гаспадаркі было наладжана 642 с.-г. канфэрэнцыі, 136 экспэдыцый, 57 аграсудоў і інш.

Курсы па сельскай гаспадарцы.

За мінулы год Наркамзем БССР арганізаваў для сялянства 309 курсаў па розных галінах сельскай гаспадаркі: лугаводству, жывёлаводству і пчалярству. Праз курсы прайшло 14.086 чалавек, што ў параўнаньні з 1925-26 г. дае на 6,5 проц. павялічэньне слухачоў.

Курсы для падрыхтоўкі інструктароў ОСО-Авіяхіму.

Пры Менскім Доме Чырвонай Арміі арганізованы алнагадовыя курсы для падрыхтоўкі інструктароў ОСО-Авіяхіму. Мэта курсаў—даць слухачам вайсковыя веды, а таксама падрыхтаваць кіраўнікоў для вайсковых гурткоў.

45.000 руб. эканоміі ў год ад скарачэньня апарату.

Галоўсацстрах БССР зараз праводзіць парміраваньне зарплаты на страхкасах і ўставаўленьне цьвёрдых штатаў для кожнай з іх. Водлуг папярэдніх даных, агульны фонд зарплаты за рахунак скарачэньня штатаў зьмяншаецца на 15 проц., што дасьць у год эканоміі да 45,000 рублёў. Конт абслугоўваньня аднаго застрахованага, такім чынам, паменшыцца на 19,7 пр.

Паступленьне страхоўкі па г. Менску.

З пачатку страхавой кампаніі па гор. Менску паступіла 8107 руб., што складае 53 проц. гадавога акладу; такім чынам, страхоўка паступае слаба, бо да 31 сьнежня г. г. павінна паступіць уся страхоўка.

Бібліятэка для вясковага настаўніцтва.

Цэнтральнае праўленьне саюзу працаўнікоў асьветы арганізуе вандроўную бібліятэку для абслугоўваньня вясковага настаўніцтва. У хуткім часе бібліятэка распачне свае працу.

Дастаўка пошты на аўтамабілях.

Менская паштова-тэлеграфная кантора робіць захады да разьвозкі пошты на акрузе на аўтамабілях. У першую чаргу дастаўка пошты на аўтамабілях будзе ўведзена з вясны 1928 г. у Астрашыцкі-Гарадок.

ФІЗКУЛЬТУРА.

Каток адчыніўся.

У суботу, 17 сьнежня, адчыніўся цэнтральны каток культадзелу ЦСПСБ. Ня гледзячы на вялікі мароз, сабралося шмат фізкультурнікаў, што сьведчыць аб вялікай зацікаўленасьці да гэтай гахіны зімовага спорту.

Агульна-гарадзкі вечар фізкультуры.

2 студзеня ў памяшканьні кіно „Культура" адбудзецца агульнагарадзкі вечар фізкультуры, які арганізоўвае Вышэйшы Савет Фізкультуры.

Праграма вечару будзе складзена з паказальных №№, у якую ўвойдзе—бокс, барба французская, джыу-джытсу, партэрная гімнастыка і інш. Збор з гэтага вечара паступіць у фонд арганізацыі сусьветных рабочых спартакіядаў.

Карнавал на лёдзе.

31 сьнежня на цэнтральным катку будзе праведзен вялікі карнавал на лёдзе з выступленьнем фігурыстаў-канькабежцаў, гульнямі на лёдзе і інш.

У т-ве «Дынамо».

Пры спартыўным пралетарскім т-ве „Дынамо" складзены хакейныя каманды. Гэта цікавая галіна спорту да апошняга часу чамусьці не праводзілася ў Менску. На цэнтральным катку хакейныя каманды ў блізкім часе правядуць паказальныя матчы для азнаямленьня Менскіх фізкультурнікаў з хакеем.

СУД.

ЗАНАДТА ДОБРАЕ «НАЧАЛЬСТВА».

20 сакавіка пад вечар у вёсцы Адасаўшчына, Койданаўскага раёну, быў склікан агульны сход у хаце селяніна Кузьмы. Да прыезду на сходку старшыні сельсавету і ўпаўнаважанага лясамі мясцовага значэньня сяляне здчынілі спрэчкі. Але вышлі ня спрэчкі, а грызьня. Кулакі крычалі, каб размеркаваць і сеч лес па палосах, а беднякі суперэчылі: лес не канюшына—зрэзаць ня доўга, а выгадаваць запатрабуецца шмат гадоў. Трэба пачакаць.

— Даволі чакаць,—аднагалосна крыкнулі кулакі.—Калі лес мясцовы і на нашай зямлі расьце—дык ён наш, і мы—гаспадары над ім.

— Дудкі, няма зямлі і лесу ўласных: гэта вам не пры Мікодцы!

Не вядома, чым скончылася-б гэта лаянка, але скрыпнулі дзьверы, у хату ўвайшлі старшыня с.-с. Жураўкевіч і ўпаўнаважаны над лясамі мясцовага значэньня Доўнар.

Усе супакоіліся. Пачалася дзелавая гутарка. Нехта ззаду крыкнуў абрацьць прэзыдыум, але начальства гэта прапусьціла мімо вушэй.

Першым выступіў упаўнаважаны Доўнаў. Ён, як прыхільнік кулакоў, бо сам карыстаецца 20 дзесяцінамі зямлі, спытаў:

— Ну, як, хлопцы, абмеркавалі наконт лесу?

— Сеч, сеч—гучна закрычалі кулакі.

Бядняк Мікола ня вытрымаў. Ён сказаў: —Тады будзеце сеч, як атрымаеце дазвол, але Доўнар абарваў яго. Раззлаваўшыся да таго, што на яго твары аж пот выступіў, ён моцна гукнуў: я лічу, калі лес, значыцца, мясцовы, дык ён наш, і мы—гаспадары

Тут з лаўкі падняўся старшыня с. с. Жураўкевіч і, хочучы паказаць сваю лабрату да кулакоў, а таксама і сілу дадзенай яму улады сказаў:

— Я дазваляю сячы лес і сход абвяшчаю зачыненым.

Усе пачалі расходзіцца па хатах.

— Добрае начальства, добра і паслухаць, —сказаў кулак Амілян.

Раніцай фурманка за фурманкай імчаліся ў лес.

Застукалі сякеры, зазьвінелі пілы. Да сьніданьня 2 дзесяціны лесу—і 713 дрэў—былі зрубаны. Сам упаўнаважаны Доўнар першы імчаў у лес з сынам, каб захапіць больш каштоўныя дрэвы.

Пачалося сьледзтва. У выніку Жураўкевіч і Доўнар прыцягнуты да адказнасьці, а на нарубшчыкаў РВК налажыў штраф у суме 1665 руб.

Менскі Акруговы Суд прытаварыў: Пётру Доўнара—на паўтара гады зьняволеньня, а Ўладзімера Жураўкевіча—на адзін год. На аснове амністыі ў адзнаку дзесятай гадавіны Кастрычніка кара Доўнару скарочана напалову, а Жураўкевіч ад кары вызвалены.

Д. Кастроў.

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

Вынікі нядбайства.

Старшыня Марына-Горскага спажывецкага таварыства Алесь Раніловіч нядбайна адносіўся да службы, у выніку чаго ў касе таварыства здарыўся недалік у суме 485 р. 77 кап.

Менскі акруговы суд прыгаварыў Алеся Раніловіча на год зьняволеньня, але на аснове амністыі ў адзнаку 10-гідоддзя Кастрычніка ад кары вызваліў.

Даляры падвялі.

Васіль Пагаралаў, будучы агентам сувязі Койданаўскага паштовага аддзяленьня, прысвоіў каштоўны пакет са 100 даляраміі, які быў прысланы з Амэрыкі на імя Зосі Стыцко.

Менскі акруговы суд прыгаварыў Васіля Пагаралага на год два месяцы зьняволеньня, скараціўшы тэрмін на аснове амністыі ваналову.

Здарэньні.

Пажар у памяшканьні №-й дывізіі.

Учора, а 7-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні №-й коннай дывізіі выбухнуў пажар, які ўзьнік ад неспраўнасьці дымаходаў у групцы.

Прыбыўшая пажарная команда хутка зьліквідавала агонь.

Страты ад пажару незначныя.

Самагубства.

Гр-ка вёскі Заракоўцы, Менскай акр., Іванеі павесілася. Прычына самагубства—нелады ў сям'і.

166050 руб. крэдыту для калектыўных гаспадарак.

У бягучым годзе Белсельсаюз мяркуе набыць для калектыўных гаспадарак 307 коняй і 1000 кароў, на што будзе адпушчана 166050 руб. крэдыту; на гэту-ж патрэбу калектыўныя гаспадаркі маюць адпусьціць 45.300 руб. з уласных сродкаў.

Рост с.-г. каапэрацыі.

У канцы 1926-27 году ў Менскай акрузе налічвалася 132 с.-г. таварыствы, якія абъядналі 44250 каапэраваных гаспадарак.

За апошні год рэалізавана с.-г. тавараў на суму 936.640 р. Зарыты с.-г. каапэрацыі за год узрасьлі на 216.946 р., а колькасьць унесеных паёў—на 77000 р.

Рознае.

АРАШЭНЬНЕ ПРАЗ ТУНЭЛЬ.

Рэспубліка Перу (Паўднёвая Амэрыка) дзеля арашэньня палёў рашыла пракласьці тунэль даўжынёй у 11 кілёмэтраў праз вілізны горны хрыбет Кордыльеры. На гэтаму тунэлю будзе пушчана вада з аднаго з прытокаў ракі Амазонкі.

КОЛЬКІ КАШТАВАЛА КАЛУМБУ АМЭРЫКА.

У архіве гішпанскага гораду Магон пры перглядзе старых рукапісаў знойдзена старадаўная запісная кніжка, якая аказалася расходнай кнігай выдатнага вандроўцы Хрыстафора Калумба, які выкрыў Амэрыку. Абсталяваньне трох караблёў, утрыманьне ў часе плаваньня ўсяго асабовага складу судоў яго эскадры (пенсія і харч) і забеспечаньне зброяй каштавала Калумбу ў 16000 р. на наша грошы.

НАВІНА Ў ПАШТОВАЙ СПРАВЕ.

На вуліцах Лёндану гарадзкая пошта ўсталявала паштовыя скрынкі, у якія можна апускаць пісьмы бяз марак. Скрынка апечатана, куды належыць пісьмо. Адначасьмо толькі тады праскочэ ў скрынку, калі ўкінеш у суседнюю скрынку манэту пэўнай вартасьці. Адначасна з гэтым на кавярні аўтаматычна ставіцца шмат, які замест сабой марку.

ЗАКОНЫ і ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра перадачу каапэрацыйным арганізацыям дзяржаўных прамысловых прадпрыёмстваў, іх інвэнтару і абсталяваньня.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Дзяржаўныя фабрыкі, заводы і іншыя прамысловыя прадпрыёмствы, пушчаныя ў ход на сродкі каапэрацыйных арганізацый, у арэндным карыстаньні якіх яны знаходзяцца, могуць прадавацца этым каапэрацыйным арганізацыям пастановамі адпаведнага народнага камісарыяту альбо акруговага выканаўчага камітэту.

2. Непрацуючыя дзяржаўныя фабрыкі, заводы і іншыя прамысловыя прадпрыёмствы, а таксама інвэнтар і абсталяваньне прамысловых прадпрыёмстваў, калі яны сталі непрыгодным, альбо ня могуць быць належным чынам скарыстаны, альбо замяняюцца з прычыны старой канструкцыі новымі, прадаюцца каапэрацыйным арганізацыям бяз публічных таргоў.

3. Пастановаю Эканамічнае Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР адпаведнага акруговага выканаўчага камітэту сума, належачая за праданую каапэрацыйнай арганізацыі маемасьць, можа залічацца, як доўгатэрміновая бяспроцантная пазычка, у асноўны капітал каапэрацыйнае арганізацыі і выплачвацца ў тэрмінны, вызначаныя па належнасьці Эканамічнаю Нарадаю альбо акруговым выканаўчым камітэтам.

4. На падставе асобнае кожны раз пастановы Эканамічнае Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР альбо адпаведнага акруговага выканаўч. камітэту пералічаныя ў артыкуле другім гэтае пастановы дзяржаўныя маемасьць можа перадавацца каапэрацыйным арганізацыям бясплатна.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.
Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.
Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.
8 сьнежня 1927 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Центрального Исполнительного Комитета и СНК БССР

о передаче кооперативным организациям государственных промышленных предприятий, их инвентаря и оборудования.

Центральный Исполнительный Комитет и СНК БССР постановляют:

1. Государственные фабрики, заводы и другие промышленные предприятия, пущенные в ход на средства кооперативных организаций, в арендном пользовании которых они находятся, могут продаваться этим кооперативным организациям постановлениями соответствующего народного комиссариата или окружного исполнительного комитета.

2. Бездействующие государственные фабрики, заводы и другие промышленные предприятия, а также инвентарь и оборудование промышленных предприятий, если они пришли в негодность, или не могут быть использованы по назначению, или заменяются вследствие устарелости конструкции новыми, продаются кооперативным организациям без публичных торгов.

3. Постановлением Экономического Совещания при Совете Народных Комиссаров БССР или соответствующего окружного исполнительного комитета, сумма причитающаяся за проданное кооперативной организации имущество, может зачисляться как долгосрочная беспроцентная ссуда в основной капитал кооперативной организации и выплачиваться в сроки установленные по принадлежности Экономическим Совещанием или окружным исполнительным комитетом.

4. На основании особого каждый раз постановления Экономического Совещания при Совете Народных Комиссаров БССР или соответствующего окружного исполнительного комитета перечисленное в статье второй настоящего постановления государственное имущество может передаваться кооперативным организациям бесплатно.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.
Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.
Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.
г. Минск. 8 декабря 1927 года.

ПАСТАНОВА

Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР

аб мерапрыёмствах па рэгуляваньні гарбарнай прамысловасьці.

Для рэгуляваньня гарбарнай прамысловасьці ў БССР, Эканамічная Нарада пры Савеце Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Будаваць новыя гарбарні і вясьці капітальныя работы, накіраваныя да павялічэньня вытворчай сілы існуючых прадпрыёмстваў, што прыналежаць дзяржаўным установам, каапэрацыйным і іншым грамадзкім арганізацыям, а таксама прыватным асобам і іх аб'яднаньням, можна толькі з дазволу Вышэйшага Савету Народнай Гаспадаркі БССР.

2. Здача дзяржаўнымі ўстановамі ў арэнду гарбарняў, а таксама аднаўленьне імі арэндных дагавораў на новыя тэрміны, дазваляецца ў кожным паасобным выпадку толькі тады калі на гэта згодзіцца Вышэйшы Савет Народнай Гаспадаркі БССР.

Старшыня Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР М. Карклін.
Намесьнік Кіраўніка Спраў СНК і Эканамічнай Нарады БССР В. Крыўіцкі.
14 лістапада 1927 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Экономического Совещания при СНК БССР

о мероприятиях по регулированию кожевенной промышленности.

В целях регулирования кожевенной промышленности в БССР, Экономическое Совещание при Совете Народных Комиссаров постановляет:

1. Сооружение новых кожевенных предприятий, а равно и капитальные работы направленные к увеличению производственной мощности существующих предприятий, принадлежащих государственным учреждениям, кооперативным и другим общественным организациям, а также частным лицам и их об'единениям, могут производиться лишь с разрешения ВСНХ БССР.

2. Сдача государственными учреждениями в аренду кожевенных предприятий, а равно возобновление ими действия арендных договоров на новые сроки, допускается в каждом отдельном случае лишь при наличии на то согласия со стороны Высшего Совета Народного Хозяйства БССР.

Председатель Экономического Совещания при Совете Народных Комиссаров БССР М. Карклин.
Зам. Управляющего Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР В. Кривицкий
г. Минск. 14 ноября 1927 г.

Пленум Менскага АВК.

Як працавалі райвыканкомы.

СПРАВАЗДАЧА БАРЫСАЎСКАГА РВК.

За справаздачны перыяд (1926-27 год) кіраўніцтва з боку РВК значна ўзмацнілася. Гэта асабліва відаць на такіх райённых установах, як лясьніцтвы, медыцынскія ўстановы, суд і інш.

Сам райвыканком і сельсаветы часткова перайшлі на плянавую працу.

Здавальняюча праведзена праца на вясеньняй пасяўной кампаніі: ачыччана 11450 пудоў насеньня, закладзена 52 паказальныя вучасткі, крэдытам забясьпечана 16 проц. гаспадарак райёну, а пры дапамозе сельска-гаспадарчага крэдыту зьмен шана колькасьць бясконных гаспадарак на 3 проц.

На шматпольны севазварот перайшло 908 гаспадарак, што складае 16 проц. агульнай колькасьці пашні.

Школьная сетка ў 1927 годзе ў райёнах павялічана на 10 камплектаў: адчынена новая 7-мігадовая школа ў Забашэвічах, двохкамплектная польская ў аколіцы Лозіна і 4-хкамплектная нярэйская ў м. Зембіне. Дзяцей школьнага ўзросту, у параўнаньні з леташнім годам, ахоплена на 1052 больш.

Значных посьпехаў дасягнула спажывецкая каапэрацыя: у 1924 годзе ў райёне было 677 пайшчыкаў, а ў 1927 годзе 4453. Паявы капітал дасягнуў 12087 руб. Каапэравана ад 30 да 70 проц. двароў.

За год было адпушчана сялянам бясплатнага лесу на 5260 руб., у крэдыт—на 9890 руб. і за грошы—на 72036 руб.

СПРАВАЗДАЧА УЗЬДЗЕНСКАГА РВК.

Пагранічнае палажэньне райёну крэпна адбіваецца на эканоміцы гаспадаркі. У 9 гадзін вечара ўжо нельга хадзіць, а, значыць, і даглядаць гаспадарку.

Спазьненьне з абкладаньнем падаткам зрабіла дрэнны ўплыў на сялянства. Згодна маніфэсту ўраду, падатак быў в некаторых зьняты. Пасьля гэтага Менск прыслаў новае абложэньне, і вышла так, быццам маніфэст не ажыцьцяўляўся на некаторых бядняцкіх гаспадарках.

РВК і сельсаветы перайшлі на плянавую працу, хоць плянаваесьць у некаторых выпадках зрываецца тым, што працаўнікі сельсаветаў вельмі часта зьмяняюцца.

У райёне ёсьць шмат сенажаці. Па рэках—Нёману, Ўзьдзянцы і іншых—сенажаць забалочана. Трэба прыняць рашучыя крокі да ачысткі рэк і да мэліярацыі балот тады сялянства будзе поўнасьцю забясьпечана сенам.

Каапэрацыя працуе добра; сельска-гаспадарчая каапэрацыя каапэравала 38 проц. усіх гаспадарак.

Прамысловасьць райёну працуе здавальняюча. Сё ета пабудована сыраварня, якая ўжо дала 800 руб. прыбытку. Таксама сёлета пабудована і цагельня, якая атрымала першую прэмію на выстаўцы.

Па амністыі ўраду СССР сельска-гаспадарчага падатку у райёне зьнята 22754 руб.

У райёне 48 школ. Дзеці школьнага ўзросту ахоплены на 75 проц.

Фабрыка штучнага шоўку.

Праэкт і пабудова фабрыкі штучнага шоўку ў ЕССР вырашыць мануфактурную праблему і зьнішчыць мануфактурны крызіс у Беларусі. Галоўная стравіна для гэтай фабрыкі—драўніна, якой у нас шмат.

Да гэтага часу на ўвесь Савецкі Саюз існавала адна невялічкая мыцішчанская фабрыка штучнага шоўку, якая займала нязначнае месца ў сусьветнай вытворчасьці. Так, у 1925 годзе у сусьветным масштабе апрацована 70000 тон штучнага шоўку, а фабрыка ў Мыцішчах вырабіла толькі 50 тон. У 1926 годзе сусьветная апрацоўка дасягнула 100000 тон шоўку, а фабрыка ў Мыцішчах—100 тон.

На спэцыяльнай камісіі пры ВСНГБ пастаноўлена арганізаваць на фабрыцы віскозны спосаб вытворчасьці (арганічная маса—віскоза) з тым, каб пасьля перайсьці на ацэтатны (анэцін—палюлёза). Апошні спосаб апрацоўкі дае шмат лепшы матар'ял: пры замаканьні шоўку, апрацованага на апошнім спосабу, ён траціць 31 проц. свае моцы, пры замаканьні шоўку, зробленага на віскозным спосабу, ён траціць 63 проц. моцы. Натуральны шоўк траціць 19 проц. моцы.

Па віскозным спосабу ў сучасны момант апрацоўваецца 88 проц. усяе сусьветнае штучнае шаўковае прадукцыі. Гэтым спосабам працуе і фабрыка ў Мыцішчах.

Ацэтатным спосабам у апошні час зацікавілася Нямеччына і пераводзіць на яго большасьць сваіх фабрык.

Выдатны навуковы дасьвед у галіне арганічнай хіміі кіеўскі акадэмік Шапашнікаў каза, што асноўнай сыравінай для ацэтатнага спосабу вырабу штучнага шоўку можа служыць драўніна, якая ў нас ёсьць ў патрэбнай колькасьці.

Галоўная карысьць ад беларускай фабрыкі штучнага шоўку будзе тая, што з масы, з якой мае вырабляцца шоўк, можна будзе выпрацоўваць шарсьцяныя, аксамітныя і плюшавыя вырабы. Апроч гэтага, з той-жа масы можна будзе вырабляць кінематаграфічныя стужкі, якія ў сучасны момант увозяцца выключна з-заграніцы.

ВСНГБ камандыраваў у Мыцішчы двох інжэнэраў-спэцыялістаў для азнаямленьня з працаю заводу.

З усяго гэтага відаць, наколькі пабудова фабрыкі па вырабу штучнага шоўку мае вялікае эканамічнае значэньне. Эса.

У МЕНСКУ РАСПАЧЫНАЕЦЦА ПАБУДОВА Ф-КІ ЦУКЕРАК.

Белхарчтрэст заказаў праэктнаму бюро пры ВСНГБ распрацаваць праэкт фабрыкі цукерак.

Для распрацоўкі праэкту запрошан адзін з выдатных спэцыялістаў—Паяркаў—тэхнічны кіраўнік фабрыкі «Красный Октябрь» (былая Эйнэм), якая абсталёвана па апошнім слову тэхнікі.

У фабрыцы маюць быць аддзяленьні: монпасье, ірыснае, мяккіх цукерак, шакаладнае, пячэньня, пасьцілы і мармаляду.

Ва ўмовах Беларусі асабліваё значэньне будзе мець аддзяленьне пасьцілы і мармаляду, бо для гэтага гатунку вырабаў у нас ёсьць найлепшая сыравіна—яблыкі «антонаўка». Апошняе аддзяленьне дасьць ня толькі прадукт для экспорту, але і паўфабрыкат для іншых заводаў Саюзу, якія, ня маючы сыравіны, ня могуць вырабляць яблычнага пюрэ.

У БССР кожны год зьбіраецца 5 з пал. міліёнаў пудоў яблык, прычым 2 міліёны пудоў з гэтай колькасьці будзе скарыстана для вырабу мармаляду.

Пад гэту фабрыку будзе выкарыстан будынак былой фабрыкі Фундылера на Серабранцы. На фабрыцы цукерак знойдуць працу да 300 рабочых.

С. А.

Водгукі на карэспандэнцыі.

— Па допісу „Лясныя справы" („С. Б". № 102 ад 8-V—27 г.) высьветлена, што справа на абвінавачаньню ўпаўнаважанага лясоў мясц. знач. Андросіка Уладзіміра па 1 ч. 105 і 1 ч. 113 арт. КК накіравана пракурору Менскай акр. для прыцягненьня да крымінальнай адказнасьці.

— Па допісу «Малазямельны працуе на кулака" („С. Б." № 227 за 1927 г.) Грозаўскі с-с паведамляе, што ім у 1926 г. была праведзена абрэзка 6 дзес. зямлі ў гр. в. Гарнастаў Місючэнкі М. А. Гэтыя 6 дзес. зямлі былі разьмеркаваны паміж 4 гаспадарамі в. Гарнастаў. Атрымаў дарэзку і ўпамянёны ў заметцы Хвядось, які мае на 7 едакоў 4 дзес. Але б. Слуцкая акр. зямельная кам. гэтай абрэзкі не зацьвердзіла і аставіла зямлю за Місючэнкам. На абразной зямлі гр-не: Хвядось і іншыя, насеялі жыта, якое, згодна распараджэньня Грэскага РВК, яны мелі права зьняць, аб чым сельсавет паведаміў членаў с-с в. Гарнастаў. Але Хвядось не хацеў „крыўдзіць" кулака і зьняў жыта напалам з ім (з Місючэнкам). Астатнія ў згоду з кулаком не ўваходзілі і засеянае жыта зьнялі поўнасьцю.

Апавяшчэньні.

Рэдакцыя газэты „Октябрь" і Белмясаюз склікаюць у сераду, 21 сьнежня, агульнагарадзкую канфэрэнцыю культурна-бытавых камісій пры жыльлёвай каапэрацыі.

ПАРАДАК ДНЮ:

1. Даклад „Октября" аб агляде жыльлёва-будаўнічай каапэрацыі 2. Справаздача культурна-бытавой камісіі Белмясаюзу і даклад Асо-Авіяхіму—„Задачы жыльлёвай каапэрацыі ў справе ваенізацыі краіны".

Канфэрэнцыя адчыніцца ў клюбе друкароў (Ленінская, 13) а 7 гадзіне вечара. Пасьля пасяджэньня—канцэрт.

Ячэйка ЛКСМБ і мясцком БДУ у сераду, 21 сьнежня, а 8 гадзіне вечара ў Доме Асьветы наладжваюць лекцыю праф. Выдрына на тэму „Аборт".

Пасьля лекцыі—адказы на пытаньні.

Увесь чысты збор—у карысьць Дому-Калёніі бясспрытульных.

Білеты ад 20 да 50 кап.

— У магазіне Белдзяржкіно на Ленінскай вуліцы праводзіцца запіс у ніадўна арганізаванае таварыства фота-аматараў. Запісацца можна штодня ад 5 да 7 гадзін вечара, апроч суботы і нядзелі.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— Сёньня, 20-XII, а 7 гадзіне ўвечары адбудзецца вачыненны сход ячэйкі КП(б)Б працаасьветы.

— У сераду, 21-XII, роўна а 6 гадзіне ўвечары адбудзецца агульны сход беспрацоўных сяброў саюзу працаасьветы.

Лука ўсіх беспрацоўных абавязкова, асабліва беспрацоўнага пэдвэрсанялу.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.

ТЭАТР-КІНО.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.
Чацьвер, 22 сьнежня—«АСТАП» Камэдыя ў 3 дзеях.
Пятніца, 23 сьнежня—«ЦАР МАКСЫМІЛЬЯН». Агульнадаступнік для рабочае моладзі.
Субота, 24 сьнежня—„Гавань", „Цырульнік з Бэрыагу", „Чорт і баба"
Нядзеля, 25 сьнежня—«БАКХАНКІ». Трагэдыя у 3 дзеях.
Панядзелак, 26 сьнежня—«БАКХАНКІ».
Пачатак а 8 з палов. гадз. вечара.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА» — Дзьве замежныя камэдыі ў адзін вечар: „Человек, которому не везет" у 7-х частках. „ПРИКЛЮЧЕНИЯ ДЖИ"—у 2-х частках.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". — Выдатны кіно-актор КОНРАД ВЭЙДТ у фільме „ПЛЯСКА НЕРВОВ" у 7-х частках.

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ». — Апошні раз „ПАЭТ І ЦАР".

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ". — Грандыёзная фільма „КЛЕЙМО ПРЕСТУПЛЕНИЯ".)—(1-я сэрыя ў 8 частках.)—(

ПРАДАЕЦЦА НАФТАВЫ РУХАВІК
фірмы „Таварыства Каломеэскіх машына-будаўнічых заводаў" ВЫПУСКУ 1922 г., 2-хвальцовы, 4-хкантактны, магутнасьцю ў 50 к. с., 270 зваротаў І ДА ЯГО-Ж ДЫНАМА-МАШЫНА 32 кілёват. 230-320 вольт, 139-100 ампэр, 980 зваротаў, 50 к. с. фірмы „Усеагульная электрычная кампанія".
ДАВЕДАЦЦА—Менск, Савецкая 63, Белдзяржвыдавецтва.

ЗГУБЛЕНЫ:
— Асабовая карт. № 35 Іванова М. І —выд. Камен. РВК, Екат. губ.
— Сяброўская кніжка № 367 Шпільмана М. Р., выд. Лепельск. спаж. т-вам.
— Пасьведчаньне аб ослабленьні ад войсков. павінасьці Панкевіча І. Р.—выд. Чарэйск. прызыўн. вучасткам.
— Сяброўская кніжка № 11, Чубукава М. Ф., выд. Лепельск. стаж. т-вам.
— Вучотна-конская карт. № 7333, Бусевіча Ф., выд. б. Капцэвіцк. ВВК.
— Сяброўская кніжка № 20083, Санько М. Д., выд. Барысаўск. акр. аддз. Саюз. Р.З.Л.

Галоўлітбел № 2468.

1928 г. ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА 1928 г.
на самую папулярную распаўсюджаную беларускую
ГАЗЭТУ „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ" ГАЗЭТУ
ОРГАН Ц.В.К. Б.С.С.Р.
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
На 1 месяц . . . . — 70 кап. „ 3 м-цы . . . . 2 р. — к.
„ 2 м-цы . . . . 1 р. 40 кап. „ 6 м-цаў . . . . 4 р. — к.
На год . . . . . 8 р. — к.
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: у Менску—у канторы газэты рог вуліц Ленінскай і К. Маркса, у правінцыі—упаўнаважанымі канторы і ўсімі паштова-тэлеграфнымі аддзяленьнямі і